Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 205 (28063) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Сяльчанкі са Століншчыны: накормім агароднінай**

СТАР. 4



**Генадзь Давыдзька ў фармаце «без гальштука»**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў:**

*«Міграцыйны крызіс у Еўропе набыў маштабы стыхійнага бедства. Штодня тысячы людзей перасякаюць межы краін Еўрапейскага саюза ў пошуках прытулку. Гэтыя людзі даведзены да роспачы. У пошуках лепшай долі яны гатовыя рызыкаваць сваім жыццём. Без сумненняў, маштабны паток бежанцаў і мігрантаў у Еўропу з'яўляецца наступствам заціжных узброеных канфліктаў у шэрагу краін Блізкага Усходу і Афрыкі, якія спарадзілі гвалт, беспакаранасць, галечу, хаос. Лічу, нельга ўшчамляць людзей у іх правах на абарону і прытулак. У гэтым кантэксце вельмі важная роля парламентарыяў. Мы павінны рэагаваць на парушэнні правоў мігрантаў і бежанцаў, прыцягваць увагу да гэтай праблемы і прыкладаць сумесныя намаганні да яе вырашэння».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.10.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 17273,00 ▲ |
| Еўра | 19545,00 ▼ |
| Рас. руб. | 275,04 ▼ |
| Укр. грыўня | 775,44 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Запас бяды не чыніць



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вівея МАКСІМОВІЧ і яе дачка Ірына ЛЯСЮК з вёскі Іказнь Браслаўскага раёна да зімы падрыхтаваліся адмыслова: у склепе стаіць больш за сто семдзесят слоікаў з хатнімі нарыхтоўкамі на любы густ. Ірына працуе ў сельскай бібліятэцы, а яе матуля — пенсіянерка, узначальвае мясцовы жаночы клуб па інтарэсах «Натхненне». Руплівым гаспадыням ёсць у каго пераймаць і з кім дзяліцца смачнымі рэцэптамі.

■ Здароўе нацыі

## НЕ ЎЖЫВАННЕ, А ЗЛО

**Захаванне і ўмацаванне здароўя грамадзян з'яўляецца стратэгічнай задачай Беларусі, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на Еўрапейскай міністэрскай канферэнцыі па пытаннях умацавання здароўя на ўсіх этапах жыцця ў кантэксце палітыкі «Здароўе-2020». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што наша краіна інвесціруе значныя сродкі ў прафілактыку захворванняў, і ў Беларусі дасягнуты станоўчыя вынікі ў барацьбе з курэннем і алкагалізмам. Таму паэтапнае скарачэнне ўжывання алкагольных напояў павінна стаць блізкай перспектывай. Урад выпрацуе да канца года адзіныя падыходы па гэтай няпростай тэме.**

Пэўныя захады ўжо зроблены — скажам, па абмежаванні рэкламы, у тым ліку схаванай, аднак высокі ўзровень спажывання паказвае, што прынятых намаганняў недастаткова. Па афіцыйных звестках, на душу насельніцтва летась прыпадала 10,5 л алкаголю. Праўда, у 2011-м размова наогул ішла пра 13,5 л. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што Сусветная арганізацыя аховы здароўя выдавала пару гадоў таму больш высокія лічбы па нашай краіне, паколькі ўлічвала і незарэгістраваны алкаголь (напрыклад, самагон). Нашы спецыялісты кажуць, што пакуль не валодаюць спецыфічнай методыкай падобнага падліку, але плануюць выкарыстаць навуковы падыход і агучыць нарэшце аб'ектыўную лічбу.

Відавочна, што любое зніжэнне спажывання абавязкова прынесціць плён. Таму не дзіўна, што ў апошнія пару гадоў фіксуецца менш смяротных выпадкаў ад атручэння і менш тых жа алкагольных псіхозаў. Аднак у цэлым, паводле слоў **намесніка начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргея КРАСУЦКАГА,** злоўжыванне алкаголем застаецца вельмі сур'ёзнай праблемай для нашага грамадства. Калі ў 2013 годзе міліцыя задакументавала 298 тысяч грамадзян, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення або распівалі ў грамадскіх месцах алкагольныя напоі, то летась гэта было 326 тысяч, а сёлета ўжо 261 тысяча.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## Дажджы і туманы

**Даволі дажджлiва і халаднавата будзе ў Беларусі на выхадныя, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэтра.**



Захаваецца няўстойлівае надвор'е на тэрыторыі краіны і ў пятніцу, калі ўдзень да нас завітае атмасферны фронт, які рухаецца з боку Заходняй Еўропы. Будзе даволі змрочна, а ўдзень амаль паўсюдна пройдуць дажджы рознай інтэнсіўнасці, месцамі сур'ёзны туман. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 5-11 градусаў. Некамфортнае надвор'е прагназуецца ў краіне і ў суботу. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах ад 3 да 9 цяпла, удзень — плюс 7-12 градусаў.

У нядзелю надвор'ем пачне кіраваць зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў вільготнай паветранай масе. У асобных раёнах пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Месцамі на працягу сутак чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 0 да 7 цяпла, удзень — плюс 7-12 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак мы зноў трапім пад уплыў атмасфернага фронту.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

# СПЕЛЫ ЛЕС

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора правёў нараду, на якой разглядалася выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па развіцці базавых арганізацый дрэваапрацоўкі.**

«Спадзяюся, на гэтым узроўні такая размова апошняя, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ўклалі немалыя сродкі. І які вынік? І што будзем рабіць далей?»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб прычынах, чаму ў свой час у краіне ўзяліся за мадэрнізацыю гэтай галіны. «Гэта зыходзіла са стратэгічных арыенціраў развіцця эканомікі Беларусі. Стратэгія заключалася ў тым, што нам трэба структурна рэфармаваць нашу эканоміку (а гэта і ёсць якраз структурная рэформа), каб удзельная вага выраблены і рэалізаванай прадукцыі на ўнутраны і знешнія рынкі была звязана з уласнай сыравінай, каб пазбегнуць залежнасці, як гэта ў нас здарылася па іншых галінах эканомікі, ад іншых дзяржаў», — сказаў Прэзідэнт.

«Тады мы ўзяліся за дрэваапрацоўку і сельскую гаспадарку, паколькі для дрэваапрацоўкі — свой лес, які мы, на жаль, да гэтага часу, па-мойму, не ўвесь, нават спелы, паспяваем перапрацаваць, ён перастойвае. А сельская гаспадарка — гэта зямля і нашы людзі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтыя галіны ствараліся не на пустым месцы, у Беларусі меліся добрыя спецыялісты і добрыя школы. «Але паколькі ў апошнія гады існавання Савецкага Саюза і ў гады ліхалецця мы істотна разбурылі эканоміку, у тым ліку і дрэваапрацоўку, трывацьдалей такі стан мы не маглі. Таму пайшлі на адпаведнае рэфармаванне гэтай галіны», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады аб выніках работы базавых арганізацый дрэваапрацоўчай прамысловасці ў бягучым годзе, пра перспектывы іх развіцця і прапановы па павышэнні эфектыўнасці работы, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Па выніках нарады Прэзідэнт прыняў рашэнне аб перадачы актываў базавых прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі Банку развіцця.

■ Партнёры

## Латвійская дэлегацыя наведала Парк высокіх тэхналогій

**Міністр эканомікі Латвіі Дана РЭЙЗНІЕЦЭ-ОЗАЛА, якая прыехала ў Мінск для ўдзелу ў правядзенні ў нашай краіне Дзён Латвіі, наведала Парк высокіх тэхналогій. Мэтай візіту стала знаёмства са сферай навукі і інфармацыйных тэхналогій Беларусі як адной з ключавых галін патэнцыяльнага супрацоўніцтва дзвюх краін.**

Міністр паведаміла, што «пошук магчымасцяў супрацоўніцтва будзе ажыццяўляцца на палітычным і практычным узроўні». Акрамя традыцыйнага партнёрства ў галіне машынабудавання, дрэваапрацоўкі, транспарту і транзіту, Беларусі і Латвіі варта развіваць узаемадзеянне ў галіне навукі і IT.

**Валерый ЦАПКАЛА, дырэктар Парку высокіх тэхналогій,** прэзентаваў Латвійскай дэлегацыі магчымасці і патэнцыял сваёй арганізацыі. Што цікава, сёння яна налічвае 150 кампаній і 22 000 праграмістаў.

Па выніках візіту ў Парк высокіх тэхналогій міністр эканомікі Латвіі, якая ў мінулым таксама займала пасаду дырэктара аналагічнага Парка ў Латвіі, адзначыла высокі ўзровень развіцця сферы інфармацыйных тэхналогій у нашай краіне ў цэлым і ўзровень арганізацыі беларускага Парка высокіх тэхналогій у прыватнасці.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ**

■ Сацапытанне

## ЗДАРОЎЕ — АСНОВА ДАБРАБЫТУ

**Для насельніцтва Беларусі галоўнымі паказчыкамі дабрабыту чалавека з'яўляюцца моцнае здароўе і адсутнасць шкодных звычак.**
**У час сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам, аб гэтым заявілі 70 працэнтаў рэспандэнтаў, паведамляе БЕЛТА.**



На другім месцы ў беларускіх грамадзян — высокі ўзровень даходу, матэрыяльная забяспечанасць (64,5 працэнта), на трэцім — наяўнасць моцнай сям'і (63 працэнты), на чацвёртым — станоўчыя чалавечыя якасці, выхаванне, адукаванасць (59,5 працэнта).

Любоў і павага з боку іншых людзей з'яўляюцца крытэрыямі дабрабыту для кожнага другога рэспандэнта (53 працэнты). Паспяховую кар'еру і высокую пасаду вылучаюць 30 працэнтаў апытаных беларусаў.

У час яшчэ аднаго рэспубліканскага сацыялагічнага апытання большасць жыхароў Беларусі (77 працэнтаў) заявіла, што краіне перш за ўсё неабходна захаваць парадак і стабільнасць.

Практычна кожны другі рэспандэнт адзначае, што трэба падтрымліваць цяперашні ўзровень жыцця і дабрабыту грамадзян (51,5 працэнта), узровень аказання медыцынскіх паслуг (49 працэнтаў), суверэнітэт і незалежнасць дзяржавы (49 працэнтаў), якасць прадуктаў харчавання і тавараў прамысловай вытворчасці (45,5 працэнта).

Крыху радзей рэспандэнты адзначаюць дасягненні ў галіне сацыяльна арыентаванай палітыкі дзяржавы (39 працэнтаў), а таксама поспехі беларускіх спартсменаў (34,5 працэнта).

Абодва нацыянальныя сацыялагічныя апытанні былі праведзены ва ўсіх абласных цэнтрах краіны і Мінску, раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах з 30 верасня па 7 кастрычніка 2015 года

■ Форум

# ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ МІРУ І САДРУЖНАСЦІ

**У сталіцы Казахстана Астане праходзіць X форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД «Гуманітарная прастора Садружнасці: агульныя каштоўнасці і дыялог культур».**

Беларускую дэлегацыю на форуме ўзначальвае міністр інфармацыі краіны Лілія Ананіч. У складзе ўдзельнікаў — дырэктар Вялікага тэатра оперы і балета Уладзімір Грыдзюшка, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў, дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір Андрыевіч, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч, прарэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Ганна Торхава.

Прывітальнае слова ад імя Прэзідэнта Казахстана ўдзельнікам форуму агучыла Дзяржаўны сакратар Рэспублікі Казахстан Гульшара Абдзіхалікава. Па традыцыі свaімі развагамі пра ролю гуманітарнага супрацоўніцтва ў развіцці і зацвярджэнні сувязяў паміж краінамі Садружнасці падзяліліся ветэраны, заснавальнікі МФГС Палад Бюль-Бюль аглы і Міхаіл Швыдкой. Раней форум праходзіў у Душанбэ і Маскве, Кіеве і Кішынёве, Мінску і Ашхабадзе, іншых сталіцах незалежных дзяржаў. Лілія Ананіч перадала ўдзельнікам форуму прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

— Жывучы ў незалежных дзяржавах, мы ўсведамляем, што існуем у адной сацыякультурнай прасторы, — дзеліцца свaімі развагамі **доктар палітычных навук з Узбекістана Даніяр АБІДАЎ.** — Кожны год мы падводзім вынікі нашага міжнароднага супрацоўніцтва. І, несумненна, аналізуем, што ўдалося ажыццявіць, праектуючы работу на заўтра. Нельга жыць толькі эканамічнымі і вытворчымі праблемамі і інтарэсамі. Міждзяржаўныя адносіны — гэта і праца інтэлектуальная, філасофская, культурнага характару.

— Я заўсёды прывожу з форумаў новыя кантакты, — кажа **дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір ПРАКАПЦОЎ.** — За гэтымі кантактамі, ідэямі — новыя выставы, новыя мастацкія альбомы. А галоўнае — судакрананне розных мастацкіх светаў, узбагачэнне адзін аднаго. Развіццё нацыянальнай культуры магчымае ў супастаўленні, у кантакце з іншымі культурамі, іншымі прасторамі. Узначальваючы ў Беларусі Канфедэрацыю творчых саюзаў, я ўпэўнены, што беларускія майстры мастацтва, дзеячы культуры прыўнясуць шмат каштоўнага ў яднанне культур і народаў краін Садружнасці. І сёння імёны нашых кампазітараў, акцёраў, пісьменнікаў з'яўляюцца знакавымі на постсавецкай прасторы. Ігар Лучанок, Расціслаў Янкоўскі, Святлана Алексіевіч, Мікалай Пінігін, Леанід Захлеўны, Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціханові, Аксана Волкава, Міхаіл Дрынеўскі — вось яркія мастацкія асобы, яркія мастацкія асяроддзі, якія прэзентуюць Беларусь!

Сёння на X форуме ў Астане праходзіць работа секцый «Насустрач 25-годдзю ўтварэння СНД» (у 2016-м — юбілей Садружнасці), «Роля музеяў у дыялогу культур», «Захаванне агульнай гістарычнай памяці і пераемнасці пакаленняў народаў краін Садружнасці», «Дыялог культур як фактар развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва ў СНД», «Еўразійскі код гуманітарнага супрацоўніцтва».

**Кірыл ЛАДУЦЬКА.**

*Казахстан, г. Астана*

# У гонар устойлівага развіцця

### Сёння ў краіне стартуе акцыя, прысвечаная 70-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

**Са станцыі «Мінск-Пасажырскі» на спецыяльным цягніку ў вандроўку па абласных цэнтрах краіны выпраўляцца 200 чалавек. Гродна, Брэст, Гомель, Магілёў, Віцебск, Мінск — цэлы тыдзень «Экспрэс ААН-70» будзе вазіць удзельнікаў па гарадах, каб сфарміраваць новыя ідэі і інавацыйныя падыходы для садзеяння развіццю і станоўчым зменам у Беларусі.**

Ідэя ініцыятывы заснавана на вопыце «Пекінскага экспрэса», які быў арганізаваны ПРААН у 1995 годзе. Тады 200 жанчын, якія прадстаўлялі краіны Усходняй Еўропы і СНД, праехалі на цягніку ад Варшавы праз Манголію да Пекіна для ўдзелу ў чацвёртай Сусветнай канферэнцыі па становішчы жанчын.

У паездку па Беларусі адпраўяцца супрацоўнікі ААН, прадстаўнікі ўрада і шырокага кола партнёраў і зацікаўленых бакоў. Цягнік будзе складацца з 10 вагонаў, амаль ва ўсіх іх цягам дарогі будуць праходзіць лекцыі, семінары, трэнінгі, дэбаты, выступленні, фестывалі кіно, выставы і воркшопы. Як у самім цягніку, так і на аб'ектах, якія наведаюць яго пасажыры, будуць арганізаваны мерапрыемствы па абмеркаванні шэрагу прыярытэтных праблем (бытавы гвалт і гендарная роўнасць, абарона дзяцей і іх правоў, правоў людзей з інваліднасцю, здароўе насельніцтва, міграцыя, ахова навакольнага асяроддзя, экатурызм і г.д.).

«Экспрэс ААН-70» дасць магчымасць павысіць узровень інфармаванасці аб новым парадку дня ў галіне развіцця і мэтах устойлівага развіцця на перыяд пасля 2015 года. Мерапрыемствы таксама прыцягне партнёраў і бенефіцыяраў у абмеркаванне пытанняў, звязаных з прыярытэтамі ў галіне развіцця ў Беларусі.

Улічваючы тое, што 2015-ты абвешчаны ў нашай краіне Годам моладзі, акцыя будзе таксама садзейнічаць шырокаму ўключэнню маладых людзей ва ўсе мерапрыемствы, а таксама забяспечыць актыўны ўдзел Маладзёжнага кансультатыўнага савета ААН (МКС ААН) у планаванні і рэалізацыі гэтай ініцыятывы.

Мяркуецца, што мерапрыемства стане пляцоўкай для прасоўвання Беларусі за мяжой, звяртаючы асаблівую ўвагу на патэнцыял краіны для інвестыцый і яе турыстычныя славутасці. У гэтай сувязі арганізатары кампаніі «Экспрэс ААН-70» паспрабуюць прыцягнуць беларускіх знакамітасцяў, пасланнікаў добрай волі ААН, а таксама дзеячаў мастацтва да ўдзелу ў сумесных культурных мерапрыемствах, мастацкіх выставах, спартыўных, культурных і адукацыйных імпрэзах, што адбудуцца падчас вандроўкі.

Ва ўсім свеце 24 кастрычніка адзначаецца як Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Для Беларусі, апроч 70-годдзя ААН, 2015 год адметны яшчэ і тым, што сёлета арганізацыя сумесна з урадам, грамадзянскай супольнасцю і прыватным сектарам прыступае да рэалізацыі новай рамачнай праграмы ААН па аказанні дапамогі ў мэтах развіцця (ЮНДАФ).

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

*seradzyuk@zviazda.by*

## НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ — КАНКРЭТНЫЯ АДКАЗЫ

**Прамыя тэлефонныя лініі працягваюцца**

**Пачынаючы з сярэдзіны студзеня, міністры, кіраўнікі аблвыканкамаў, мэры і іх намеснікі адказалі на тысячы пытанняў і далі сотні даручэнняў адказным органам. Патэлефанаваўшы на «прамую лінію», грамадзяне заўсёды могуць разлічваць на тое, што іх зварот будзе разгледжаны.**
**Такая форма зносін у краіне створана ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

**У гэтую суботу, 24 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 на сувязь з грамадствам выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні абласнога Савета дэпутатаў ХРЫСТАФОРАЎ Аляксандр Мікалаевіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (5004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня гарадскога Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васільевіч (2224444).

■ 50+

# ІЗНОЎ У СТУДЭНТЫ

## Пажылым людзям прапануюць вучыцца самім і навучаць іншых

**У актавай зале БДУІР сабраліся не зусім звычайныя першакурснікі, самаму малодшаму з якіх — ужо за 60. Усе яны прыйшлі на ўрачыстае пасвячэнне ў студэнты Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту.**

78-гадовая Слава Вікенцьеўна і 62-гадовая Тамара Іосіфаўна пазнаёміліся і пасябравалі на занятках, што ўжо пачаліся ва ўніверсітэце. «І я вельмі рада гэтаму знаёмству!» — з запалам дадае Слава Вікенцьеўна.

«Мне не хацелася абмяжоўвацца толькі домам і кухняй, у мяне актыўная натура. Цікаўлюся паэзіяй, люблю спяваць рамансы. Часам гляджу ў люстэрка і кажу: ах, як гэтыя люстэркі пастарэлі!.. А тут па радыё пачула аб'яву, што ідзе набор у гэты ўніверсітэт. Я адразу ж панеслася запісвацца. У 11 гадзін была ўжо 200-й у чарзе! — распавядае жанчына. — Я запісалася на факультэт здароўя. Хацела трапіць і на курсы камп'ютарных тэхналогій, і мяне запісалі на другі паток: пайду вучыцца працаваць з камп'ютарам у лютым. Мне сорамна перад дзевяцігадовым унукам: ён ведае камп'ютар, а я не. Таму вырашыла таксама навучыцца!»

А вось Тамара Іосіфаўна, акрамя заняткаў на факультэце здароўя, ужо была на двух занятках па камп'ютарных тэхналогіях. Расказала аб універсітэце ёй прыяцелька, якая вывучала тут польскую мову. «Мы планавалі з ёй хадзіць на скандынаўскую хаду, але пакуль няма валанцёра, які б вёў заняткі. Спадзяюся, што ён знойдзецца», — кажа Тамара Іосіфаўна.


78-гадовая Слава Вікенцьеўна і 62-гадовая Тамара Іосіфаўна пазнаёміліся і пасябравалі ва ўніверсітэце.

Усяго сёлета падалі анкеты 1452 чалавекі ва ўзросце ад 60 гадоў, якія жадаюць навучацца ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту. Залічаны 930 чалавек. А самому ўніверсітэту ўжо тры гады.

— За два папярэднія гады больш за 2 тысячы мінчан ад 60 і старэйшыя навучыліся працаваць на камп'ютары, апрацоўваць здымкі ў праграме Photoshop, самастойна арганізоўваць турыстычныя экскурсіі, загаварылі на замежных мовах, асвоілі журналістыку і шмат што іншае, — кажа **кіраўнік праекта, выканаўчы дырэктар Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Алена СТАНІСЛАЎЧЫК.** — Гэта стала магчымым дзякуючы валанцёрам-выкладчыкам. У ролі настаўнікаў выступаюць студэнты, працуючыя спецыялісты, а таксама самі пенсіянеры.

Сёлета, паводле слоў **спецыяліста па камунікацыях Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Вольгі ШЫШЛО**, універсітэт прапануе навучанне ўжо па 19 напрамках. У пажылых людзей з'явілася магчымасць вывучаць, акрамя папулярных англійскай і нямецкай моў, таксама японскую мову, а яшчэ — асвоіць фотасправу і ландшафтны дызайн, журналістыку, псіхалогію, краязнаўства і нават навучыцца здымаць дакументальнае кіно! Усе ахвотныя змогуць заняцца лячэбнай гімнастыкай, стрэтчынгам або аздараўленчым комплексам «60+».

Таксама ў гэтым годзе пры Мінскім універсітэце трэцяга ўзросту адкрыўся цэнтр валанцёраў, дзе кожны можа прайсці навучанне і атрымаць дапамогу ў рэалізацыі ўласнай ініцыятывы. Яшчэ адна прыемная навіна: слухачы ўніверсітэта ўпершыню атрымаюць імянныя студэнцкія білеты.

І, як сказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА,** акрамя заняткаў на пляцоўках вядучых ВНУ краіны, зараз у пажылых людзей з'явілася магчымасць займацца і па месцы жыхарства — у рамках крокавай даступнасці навучальныя заняткі будуць праходзіць на базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага і Савецкага раёнаў сталіцы.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# 1881 ЧАЛАВЕЧАЕ ЖЫЦЦЁ

## ўратавалі з 2002 года аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі

**Гэтыя прыборы сталі атрыбутам многіх дамоў за апошнія гады. Асабліва важнымі яны становяцца цяпер, калі з-за малога светлавога дня людзі праводзяць больш часу не на вуліцы, а дома. Перагрузка электрасеткі з-за магутных прыбораў, непатушаная цыгарэта ў ложку, няправільная эксплуатацыя печы — прычын пажару ў гэты час дастаткова.**



— Тым, хто мае патрэбу ў дадатковай сацыяльнай абароне, аўтаномны пажарны апавяшчальнік паставяць бясплатна, — запэўнівае **начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір РАФАЛЬСКІ.** — Трэба толькі звярнуцца ў выканкам ці да камісіі пры дадатковым абследаванні жылля. Калі ж вы ў гэты пералік не трапілі, нічога страшнага няма: прыбор каштуе зусім нядорага. Але карысць ад яго вялікая — незалежна ад часу сутак ён кантралюе сітуацыю і ў выпадку чаго пабудзіць людзей у хаце. Людзі ж гінуць не столькі ад агню, колькі ад чаднага газу. Тым больш што ў сучасных кватэрах, якая літаральна нашпігавана ўсякімі сінтэтычнымі рэчывамі, літаральна некалькі ўдыхаў атручанага паветра могуць забіць чалавека. Ад 2002 года гэтыя прыборы ўратавалі 1881 чалавека. І гэта толькі тыя выпадкі, пра якія мы ведаем. Але ж здараецца і так, калі апавяшчальнік будзіць ад сну і пажар тушаць сваімі сіламі, без выкліку сіл МНС.

Каментуючы трагедыю, якая здарылася ў сталіцы ўвечары ў мінулую нядзелю (нагадаем, тады ў нежылым прыватным доме, які гарэў на ўскраіне Мінска, загінулі тры чалавекі), Уладзімір Рафальскі зазначыў, што зараз разбор па справе праводзіць Следчы камітэт. Але адказу на пытанне, з-за чаго ж разыгралася вогненная драма, пакуль няма.

— З Міністэрствам унутраных спраў у нас маецца сумесная інструкцыя па абследаванні гарышчаў і падвалаў пэўных будынкаў, а таксама дамоў, дзе ніхто не жыве. Усе такія праблемныя месцы вядомыя. Але ж загарадзіць да іх усіх падыходы і паставіць паўсюль супрацоўнікаў, шчыра кажучы, складана. Таму мы іх перыядычна маніторым, адпрацоўваем таксама гарышчы і падвалы. Пабочных асоб там быць не павінна, а ўваходы мусяць быць зачынены ці заблакаваныя.

У халады ў прыватных дамах пачынаюць масава выкарыстоўвацца печы. Зрэшты, гаспадары пабудоў не заўжды выконваюць належныя правілы іх эксплуатацыі. 20 кастрычніка ў Магілёўскай вобласці саракагадовы мужчына пры распальванні печы выкарыстоўваў бензін. Імкненне да таго, каб дровы лепш гарэлі, скончылася апёкамі. Таму спецыялісты яшчэ раз нагадваюць аб правілах карыстання печчу. Яны вельмі простыя: не трэба перапальваць печ, варта прыбіць перад ёй металічны ліст і перастаць паддаваць жару за дзве гадзіны да адыходу да сну.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Інтэрактыў

# КАЛІ ГІСТОРЫЯ... АЖЫВАЕ

**Выпуск першага мультымедыйнага адукацыйна-забаўляльнага часопіса «Музейныя вандроўкі» для дзяцей і падлеткаў арганізавалі Нацыянальны гістарычны музей Беларусі і мабільны аператар Velcom.**

Часопіс у займальнай форме будзе распавядаць маленькім чытачам пра самыя цікавыя моманты з гісторыі Беларусі, абапіраючыся на багатую музейную калекцыю. Першы нумар, які выйшаў на 26 старонках, цалкам прысвечаны эпосе сярэднявечча, тэме рыцарства і шляхецтва ў Беларусі. Некаторыя тэксты суправаджаюцца інтэрактыўнымі матэрыяламі. Так, напрыклад, у артыкуле «Хто такія рыцары?» змяшчаецца рэпрадукцыя палатна XVI стагоддзя «Бітва пад Оршай» невядомага аўтара. Яго дэталёвы прагляд суправаджае аўдыяролік з аднайменнай песняй беларускага калектыву сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса». З «Музейнымі вандроўкамі» можна пазнаёміцца на сайце Нацыянальнага гістарычнага музея або спампаваць часопіс на смартфон — яго версія адаптавана для выкарыстання на мабільных прыладах.

Прэзентацыя першага нумара адбылася падчас адкрыцця сумеснага праекта «Музей дзецям з Velcom». У яго рамках Нацыянальны гістарычны музей і мабільны аператар стварылі новую інтэрактыўную музейна-пазнавальную прастору для дзяцей, у якой будуць праходзіць тэарэтычныя і практычныя заняткі, прысвечаныя гісторыі Беларусі, яе традыцыям і культуры. Аўтары ідэі ставілі за мэту заахвоціць дзіцячую дапытлівасць і абудзіць цікавасць да гісторыка-культурнай спадчыны.




Вельмі важна, што найноўшыя методыкі і тэхналогіі ў гэтым праекце аб'яднаны з аўтэнтычнымі элементамі. Так, нова абліччa набыла зала «Жывая археалогія». Яна пераносіць наведвальнікаў у часы позняга бронзавага веку (тут аднаўлены некаторыя функцыянальныя элементы падворка таго часу з ткацкімі прыстасаваннямі, станком для свідравання каменю, крамянёвымі сякерамі і іншымі прыладамі працы) і дазваляе паглыбіцца ў мінулае праз актыўнае дзеянне і стварэнне сваімі рукамі храстаматыйных музейных артэфактаў. Акрамя таго, у зале быў павялічаны археалагічны раскоп і створана спецыяльная прастора «Лабараторыя археолага».

Немалаважна, што інтэрактыўная прастора прыстасавана для дзяцей розных узростаў. Тут прадугледжана гульнявая зона для дашкольнікаў, сектар для паказу батлеечнага спектакля і сектар-лекторый для правядзення заняткаў, лекцый і гульняў. Інтэрактыўная зона для самых маленькіх (2,5-5 гадоў) дазваляе вывучаць гісторыю краіны ў даступнай для іх узроставай форме. Яна ўключае інтэрактыўныя стэнды, стол для малявання і збору пазлаў і іншыя элементы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ЭМБЛЕМА ПРЭМІІ — У МАРКІРОЎЦЫ ТАВАРУ

**Прэмія Гродзенскага аблвыканкама за дасягненні ў галіне якасці — гэта не толькі дыпломы, дэкаратыўныя прызы і грашовае ўзнагароджанне.**

Акрамя таго, лаўрэатам (юрыдычным асобам рознай формы ўласнасці) дадзена права на працягу пяці гадоў выкарыстоўваць выяву прэміяльнай эмблемы ў маркіроўцы сваёй прадукцыі, дакументацыі і рэкламе. Прычым яны могуць пацвердзіць гэтае званне пасля заканчэння пяцігадовага тэрміну. Што і зрабілі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Малочны свет» і «Гродзенскі мясакамбінат». А лаўрэатамі прэміі (у трох падгрупах з колькасцю работнікаў да 500, ад 500 да 1000, больш за 1000 чалавек) па выніках мінулага года ўпершыню прызнаны прадпрыемствы «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» (г. Ліда), Ашмянскі і Слонімскі мясакамбінаты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Небяспека

# Ахвяры метадону

**Двое загінулых і адзін на бальнічным ложку — такі жахлівы вынік спробы атрымаць кайф пад уздзеяннем наркатычнага сродку. Як высветлілася, «паслугу» жыхарам Салігорска аказаў прадстаўнік цыганскай дыяспары з Бабруйску.**

— Мужчына быў затрыманы пры спробе збыць чарговую порцыю метадону, — паведаміў першы намеснік начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама, палкоўнік міліцыі Аляксандр Васільеў. — Падчас расследавання было ўстаноўлена, што менавіта ён прадаў небяспечны сродак чатыром раней судзімым і нідзе не працуючым жыхарам Салігорска. Пасля ўжывання метадону аднаму з іх стала дрэнна і яго даставілі ў бальніцу. Але астатніх гэта не спыніла. Двое з іх памерлі і былі пакінутыя іх знаёмым на прыпынку грамадскага транспарту ў Глуску.

Бабруйскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь у дачыненні да затрыманага бабруйчаніна распачата крымінальная справа па частцы 5 артыкула 328 КК Рэспублікі Беларусь, якая прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 12 да 25 гадоў. Гэта першы ў краіне выпадак, калі справа разглядаецца з улікам змен, прадугледжаных Дэкрэтам Прэзідэнта №6, якія былі ўнесены ў Крымінальны кодэкс.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# «МЫ ЎСЮ КРАІНУ МОЖАМ НАКАРМІЦЬ АГАРОДНІНАЙ»

## Сельскія працаўніцы са Століншчыны — аб магчымасцях і праблемах сваіх гаспадарак

**Даўно здабылі вядомасць агурочнай сталіцы Палесся Альшаны. Але шчырыя працаўнікі жывуць не толькі ў названай вёсцы, такіх людзей нямала па ўсёй Століншчыне, асабліва іх многа ў давыд-гарадоцкай зоне. Так склалася аб'ектыўна. У раёне няма столькі прадпрыемстваў і сельгасарганізацый, якія маглі б забяспечыць працай насельніцтва. Таму людзі здаўна бралі ўчасткі зямлі і вырошчвалі сельгаспрадукцыю самастойна. Ёсць населеныя пункты, дзе фактычна ўсе жыхары маюць цяпліцы. Тут нават для настаўніка або медыка лічыцца дзіўным не мець дадатковага прыбытку з агарода. Такога чалавека грамадская думка запіша ў лайдакі. Многія працаўнікі, з якімі даводзілася размаўляць, адзначаюць, што пасля першага ўдалага ўраджаю з'яўляецца азарт: налета зрабіць яшчэ больш і атрымаць большы прыбытак. Ну а для большасці сельскіх гаспадароў гэта пытанне выжывання, годнага ўтрымання сям'і, магчымасці для выхавання і адукацыі дзяцей.**

Некалькі гадоў таму мне пашчасціла пазнаёміцца з цікавай сям'ёй з вёскі Велямічы — Ірынай і Канстанцінам Машлякевічамі. Яны даўно займаюцца вырошчваннем агуркоў. Смела эксперыментуюць з рознымі іншымі культурамі. У сваёй уласнай гаспадарцы стараюцца ўкараніць усё новае, перадавое. Таму сочаць за літаратурай, не прапускаюць магчымасці паўдзельнічаць у якім-небудзь семінары, пабываць на выставе. Такую магчымасць гаспадарам прыватных сядзіб нярэдка дае Столінскі цэнтр сельскага развіцця.

Вось і на гэты раз цэнтр арганізаваў цікавае мерапрыемства, прычым выязное. Група вясковых працаўніц са Століншчыны наведала аграсядзібу «На Зарэчнай вуліцы» пад Кобрынам. І хоць гэту імпрэзу сціпла назвалі азнаямляльнай паездкай, насамрэч тут адбыўся сапраўдны семінар па некаторых асаблівасцях вядзення хатняй гаспадаркі. Як потым дзяліліся ўражаннямі яго ўдзельніцы, кожная з іх даведалася нешта новае, занатавала рэцэпт смачнай стравы, маленькую цікавінку з дызайну падворку альбо інтэр'ера дома.



— Ды і абмен думкамі пра вядзенне агароду пайшоў, несумненна, на карысць, — заўважыла старая знаёмая **Ірына МАШЛЯКЕВІЧ**. Ірына Леанідаўна па-ранейшаму выкладае ў школе гісторыю. Гаспадаркай пераважна займаецца яе муж, яна дапамагае толькі вечарамі, ды яшчэ ў сезон адрывае гадзінку ад сну і шчыруе ў цяпліцы з пяці да шасці-сямі раніцы, а таксама летам, падчас адпачынку. Вось што яна сказала:

— Сёлета мы вырошчвалі, як заўсёды, агуркі, яшчэ капусту, моркву. Садзілі крыху памідораў, капусты брокалі і квяцістай, але гэта пераважна для сябе. Прадукцыю вязём на аптовы рынак у Альшаны. На агуркі сёлета цаны не было, па сутнасці, людзі толькі павярталі грошы, укладзеныя ў вытворчасць. Гэтак жа і мы. Спадзяемся нешта зарабіць на капусце і моркве.

Некалькі гадоў таму мы загарэліся ідэяй атрымаць другі ўраджай клубніц. І сабралі яго ў кастрычніку! Але гэта так і засталося праектам для сябе. Бо попыту на ягады ў гэту пару не было. Нашы гандлёвыя арганізацыі могуць вазіць клубніцы з Еўропы ў любы час года. Мы ж не змаглі прадаць тады, а болей не рызыкавалі. Калі і вырошчваем познія клубніцы, то роўна столькі, колькі можам спажыць у коле сям'і і знаёмых. Пагаварылі вось са сваімі «калегамі» на семінары і прыйшлі да высновы, што нашы гаспадары вырасцілі б што заўгодна, і Століншчына дакладна накарміла б агароднінай усю краіну, каб мы маглі арганізаваць збыт прадукцыі. А так мы ўвесь час у своеасаблівай зоне рызыкі: прадасі — не прадасі.



**Святлана КРУГЛІЧ** — таксама гаспадыня па сумяшчальніцтве, бо мае асноўную працу. Яна працуе медсястрой у Веляміцкай амбулаторыі. З яе траіх дзяцей двое — студэнты, значыць, дапамагчы могуць толькі на канікулах. Асноўны работнік цяпліцы і поля — муж. Менавіта пасля кансультацый цэнтра сельскага развіцця велямічкія гаспадары стварылі кааператыў, у складзе якога лягчэй заключаць дагаворы, вырашаць іншыя арганізацыйныя пытанні.

— І ўсё ж асноўным пытаннем застаецца збыт, — згаджаецца з каляжанкай Святлана Кругліч, — і звязаныя з гэтым рызыкі. Ну вось, напрыклад, сусед сёлета патраціў 50 мільёнаў рублёў на абсталяванне цяпліцы. І грошы не змог вярнуць за сезон.

— Яшчэ хачу адзначыць, — працягвае Святлана, — што прадукцыя наша чыстая. Мы прымяняем вельмі мала ўгнаенняў. Прывяду такія разлікі: кілаграм агуркоў мы здавалі сёлета па цане 2 тысячы рублёў, а кілаграм ўгнаення каштуе 70 тысяч рублёў. Шмат не накупляешся. За якасць сваёй прадукцыі мы адказваем. Напрыклад, летам муж павёз пекінскую капусту ў Гомель, паводле папярэдняй дамоўленасці з гандляшай сеткі кіёскаў на рынку. Яна спачатку панесла некалькі «качаноў» у лабараторыю на праверку. А потым хуценька патэлефанавала знаёмым гандлярам. Яны прыхапілі яшчэ знаёмых, прыбеглі і разабралі тавар для сябе. Гэтыя людзі штодзень маюць стасункі са спецыялістамі лабараторыі і разбіраюцца ў якасных паказчыках агародніны.



**Ірына СІМАНОВІЧ** з вёскі Высокае займаецца толькі ўласнай гаспадаркай. У яе 14 сотак адведзена пад цяпліцу і 50 сотак зямлі ў полі. Вырошчвае жанчына агуркі, памідоры, капусту.

— Апошнім часам нядрэнны ўраджай даюць перцы, — гаворыць Ірына. — Я, як і мае суседзі-гаспадары, стараюся эксперыментаваць, вырошчваць адразу некалькі сартоў розных культур, каб вызначыць той з іх, які найлепш адчувае сябе ў нашых шыротах. Перцы, як і іншую агародніну возім на аптовы рынак у Альшаны. Забіраюць іх цяпер вадзіцелі-азербайджанцы і кажуць, што вязуць у Маскву і Піцер. Значыць, кормім вітаміннай прадукцыяй жыхароў расійскіх сталіц. І, вядома, стараемся трымаць марку. Сёння ўжо мала вырасціць агародніну, трэба, каб яна адпавядала нормам якасці і мела прывабны знешні выгляд. Таму маюць значэнне насенне, агратэхніка і іншыя нюансы земляробства. У сэнсе кансультацый па агранаміі нам дапамагае цэнтр сельскага развіцця. Не так даўно ён праводзіў «Дзень поля» па капусных культурах. Сама назва гаворыць, што мы сустракаліся ў полі, абменьваліся вопытам, задавалі пытанні спецыялістам. Асабіста я адчуваю карысць ад такіх семінараў.



**Наталля АНДРАЙКАВЕЦ** таксама жыве ў Высокім. Займаецца гаспадаркай, з-за якой у свой час адмовілася ад работы ў гандлі. Сям'я Наталлі, як і іншыя, мае ўчастак зямлі ў полі і цяпліцу, якую тут звычайна называюць парнікам. Жанчына расказала пра цікавы пачын гаспадароў з вёскі Высокае:

— У нас скааператаваліся тры сям'і — мы і нашы сваякі — і купілі матаблок «Фермер» з наборам сельгастэхнікі. Маецца ва ўвазе плуг, прычэп, бульбакапалка і іншыя агрэгаты. Перад купляй мы ўсё пралічылі, прыйшлі да высновы, што для адной сям'і такая пакупка абышлася б вельмі дорага. А на траіх — цалкам прымальна. Тэхнікі нам хапае на ўсе сезонныя работы ў полі. А калі набываць яе для аднаго гаспадара, то большую частку года яна прастойвала б. На нашы надзелы зямлі, умоўна кажучы, цэлы трактар не патрэбен. Лічу, што наш досвед можа быць карысным для іншых гаспадароў. Кажуць, што ў Польшчы фермеры тэхніку купляюць менавіта ў кааперацыі.

**На пачатку сезона, недзе ў лютым, цэлы месяц спаць даводзіцца амаль што на вуліцы. Гаспадар перабіраецца на начлег у цяпліцу, дзе трэба бесперапынна падкідваць паліва пад кацёл.**

Работа сельскага гаспадара вельмі нялёгкая. Адзін толькі прыклад: на пачатку сезона, недзе ў лютым, цэлы месяц спаць даводзіцца амаль што на вуліцы. Гаспадар перабіраецца на начлег у цяпліцу, дзе трэба бесперапынна падкідваць паліва пад кацёл. Бо асноўны заробак, як правіла, бывае на ранняй прадукцыі, якая пачынае расці яшчэ зімой, — дадае Наталля.

**Спецыяліст Столінскага цэнтра сельскага развіцця Марыя АНДРУСІК** зазначае, што столінскія сельскія жанчыны не толькі нястомныя працаўніцы, што паспяваюць вырасціць-сабраць ураджай, яны яшчэ ўмела выхоўваюць дзяцей, спраўна вядуць хатнюю гаспадарку, пры гэтым умудраюцца добра выглядаць, цікавяцца навінамі, перадавым, што ёсць у свеце. Цэнтр аказвае ім метадычную падтрымку, у тым ліку ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Сетка агароднікаў па эксперыментаванні, абмене і распаўсюджванні інфармацыі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Вось і гэтая паездка на Кобрыншчыну, несумненна, паслужыла справе атрымання інфармацыі.

Гаспадыня аграсядзібы **Ала ПАЛІКАРПУК**, старшыня грамадскага савета па агра-экатурызму Кобрынскага раёна, падзялілася досведам, як адкрыць уласную аграсядзібу, і правяла майстар-клас па прыгатаванні страў беларускай і стараславянскай кухні. А за абедам удзельніцы маглі пачаставацца тым, што згатавалі пад кіраўніцтвам умелай гаспадыні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*



Майстар-клас ад Алы ПАЛІКАРПУК.

# НЕ ЎЖЫВАННЕ, А ЗЛО

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Расце і колькасць пратаколаў, складзеных на працоўных месцах. Большасць такіх злачынстваў, як разбоі, рабаванні, хуліганства, наўмысныя прычыненні цялесных пашкоджанняў, учыняюцца менавіта ў стане алкагольнага ап'янення. Такіх парушальнікаў па рашэнні суда могуць накіраваць у лячэбна-працоўны прафілакторый. Калі летась за ўвесь год у такія ўстановы адправіліся каля 6,5 тысячы парушальнікаў правапарадку, то сёлета ўжо 6,4 тысячы, кожная пятая з якіх — жанчына.

Дарэчы, мэта такіх прафілакторыяў — ізаляцыя, а не лячэнне. Медперсанал, які працуе ва ўстановах, аказвае толькі першую медпамогу або можа прапанаваць, скажам, псіхатэрапеўтычную дапамогу для пазбаўлення ад залежнасці. Наогул сёння ва ўсіх рэгіёнах даступныя лячэнне і рэабілітацыя алкагольнай залежнасці. Ацэніць іх эфектыўнасць не ўяўляецца магчымасці па прычыне адсутнасці нейкіх дакладных крытэрыяў. Самае лепшае, што можа быць, — адмаўленне ад алкаголю на ўсё жыццё, але нават зніжэнне ўжытай колькасці або працяглае ўстрыманне лічыцца прагрэсам. У свеце надаюць увагу не толькі рэмісіі, але яшчэ і якасці жыцця: ці знайшоў залежны працу, ці аднавіў стасункі з сям'ёй? Усё гэта даволі складана падсумаваць.

Як адзначае **кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра маніторынгу і прэвенталогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксей КРАЛЬКО**, у краіне на базе шэрагу наркалагічных устаноў добра прыжыліся некалькі кароткатэрміновых праграм рэабілітацыі цягам да аднаго месяца. Цяпер ідзе распрацоўка доўгатэрміновых, 6-месячных, праграм. У перспектыве — пашырэнне даступнасці рэабілітацыйнай дапамогі, удасканаленне дыягнастычнай і лячэбнай дапамогі.

А непаўналетнім (іх сёння на ўліку 13 тысяч, і гэта галоўным чынам тыя, хто трапіў у поле зроку міліцыі нападпітку, бо ўласна залежных у такім узросце адзінкі) патрабуецца сур'ёзная работа са спецыялістамі-нарколагамі, псіхакарэкцыя, а ў ідэале — добрае выхаванне, якое па-за магчымасцямі работы вышэйзгаданых інстытутаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ А не шкодзь!

### З ЛІХТАРАМІ ПАД ВАДОЙ

**83 кілаграмы буйной рыбы налавілі два кармянцы на Сожы. І гэтаму ўлову можна было б толькі пазайздросціць, каб не прылада рыбалоўства — мужчыны прамышлялі забароненымі восцямі.**

— Лавілі ноччу, выкарыстоўваючы для падсветкі аўтафары, — расказала падрабязнасці **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Парушальнікі здабылі 26 ляшчоў і яшчэ 19 асобін іншых відаў рыб. Аднак «кулібіны» не ўлічылі, што пры такой падсветцы здалёку было відаць і іх саміх. Браканьераў затрымалі супрацоўнікі Кармянскай міжрайінспекцыі. Ім давядзецца выплаціць амаль 37 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by* ■

TV@R

Генадзь ДАВЫДЗЬКА:

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ Ў ЛЮБОЙ АРГАНІЗАЦЫІ — ЛЮДЗІ»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Наш сённяшні суразмоўца Генадзь Давыдзька мае багаты і разнастайны прафесійны вопыт. Адны ведаюць і памятаюць яго як акцёра кіно і тэатра. Ёсць і тыя, хто меў магчымасць працаваць з ім як з рэжысёрам і дырэктарам Купалаўскага. А потым настаў новы перыяд — праца на тэлебачанні. З 2010 года Генадзь Браніслававіч узначальвае Белтэлерадыёкампанію. За час яго кіравання там адбываліся розныя перамены. У прыватнасці, з'явіліся сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» і першы нацыянальны спартыўны «Беларусь 5», а цяпер пачаў вяшчанне (праўда, пакуль яшчэ не ва ўсіх абласцях) рэгіянальны тэлеканал «Беларусь 4»... Падчас сустрэчы «без гальштука» мы ўзгадалі мінулае, пагаварылі пра сучаснасць і даведаліся пра найбліжэйшыя планы.**

## ВЫПРАБАВАННЯЎ ШМАТ, АЛЕ ТЫМ І ЦІКАВЕЙ ЖЫЦЬ

***— Генадзь Браніслававіч, нядаўна вы адзначылі 60-годдзе. З якім настроем, думкамі і вынікамі сустрэлі юбілей?***

— Мая самая галоўная думка — што жыццё вечнае, а любая пасада карацейшая за яго. Справа, якой займаешся, — яна бязмежная, і ў любой прафесіі немагчыма дасягнуць дасканаласці і неверагодных вяршынь. Заўсёды ёсць час і патрэба вучыцца, спасцігаць новыя веды, спрабаваць і шукаць штосьці. Усё працягваецца. І гэты лік 6:0 на карысць жыцця вымушае мяне зноў заставацца ў гэтай гульні, каб потым, магчыма, зноў прайграць ці выйграць.

***— У вашай біяграфіі ёсць акцёрскае мінулае. Яно дапамагае вам па жыцці знаходзіць напрамак руху?***

— У жыцці любога чалавека нічога не бывае проста так. Заўсёды ёсць нейкі шлях, які нам трэба прайсці. Некаму выпадаюць асаблівыя, выключныя выпрабаванні, іншым шчасціць увесь час, а нехта вымушаны праз вялізныя цяжкасці праходзіць. Што тычыцца майго жыцця, біяграфіі, прафесіі, то ўсё было так, як павінна было быць. Неба, Гасподзь рыхтуе кожнага чалавека да той місіі, якую яму наканавана выканаць. Я разумею, што на тых пасадах, якія я займаю апошнім часам, неабходны менавіта тыя веды, навыкі, якія ёсць у мяне, і нічога не было дарма. Прафесія акцёра, рэжысёра вельмі карысная для кіраўніка. Тыя юрыдычныя, эканамічныя веды, што я набываю, працуючы штодня, таксама патрэбныя, як і тэлевізійныя мае навыкі (я 1982 года працую на тэлебачанні ў розных якасцях). Заняць такую пасаду для мяне быў гонар, і разам з тым я ўсведамляў вялікую адказнасць. Але разумею, што чалавеку нічога не даецца без падрыхтоўкі. Калі крыж вам дадзены, то вы яго павінны несці. Гэта тычыцца не толькі пасад, але і жыцця ўвогуле. Выпрабаванняў шмат, але тым і цікавей жыць.

***— Вяртаючыся да перыяду, калі вы здымаліся ў кіно, ігралі ў тэатры... Якія ўспаміны засталіся пра тыя часы?***

— Я шмат сустракаюся з тэлегледачамі. І, ведаеце, да гэтага часу мне задаюць пытанні пра тэатр, пра кіно, пра маю рэжысёрскую дзейнасць. Безумоўна, гэта здзіўляе і неяк усцешвае, што мяне памятаюць як акцёра. Значыць, усё не дарэмна, калі людзі помняць? Якія ўспаміны пра той час? Як пра дзяцінства, даволі бесклапотнае. Хаця, калі згадваць дакладна кожны эпізод, кожны момант і кожную ролю, то можна ўспомніць, як цяжка ўсё давалася. Галоўныя мае ўспаміны цяпер тычацца нават не творчасці, а самога жыцця ў калектыве Купалаўскага тэатра, адносін паміж людзьмі, мэтраў. Я неяк казаў, што да стагоддзя Купалаўскага тэатра засталося пяць гадоў, і трэба распачынаць працу над кнігай пра яго. Зрабіць кнігу ўспамінаў пра тых, хто жыве, памятае пра Купалаўскі тэатр, бо яго гісторыя — гэта гісторыя нацыі.

***— Як паўплываў той перыяд на вас цяперашняга? Ведаю, што ў часы працы ў Купалаўскім вы вывучылі беларускую мову, паказалі сябе ў знакавых ролях...***

— Гэта перыяд майго сталення. Я там развітаўся з юнацтвам. З максімалістычным, ідэалістычным уяўленнем пра свет. У тых сценах пачалося маё станаўленне як асобы. Таму што там былі вельмі цяжкія выпрабаванні: трэба было з акцёра пераўтварыцца ў рэжысёра, а з часам стаць дырэктарам тэатра. А гэта складана і ў чалавечых адносінах, і ў адказнасці, якая звальваецца на цябе. Потым сама беларуская мова... я ж не вучыўся ў беларускай школе, бо вырас на Далёкім Усходзе. Трэба было навучыцца і гаварыць па-беларуску, і пісаць, і думаць, што я з задавальненнем рабіў. Бачыце, хто жыве ў Беларусі заўжды, той не разумее, што тут рай і якое вялікае шчасце, што растуць яблыкі на дрэвах. Званы на цэрквах, цягнікі з іх гукамі, пахам... увогуле нашы краявіды, прычым у любую пару года. А калі прыязджаеш і бачыш людзей, гэтую ўсю прыроду, то проста адчуваеш у сабе любоў да зямлі, якую ты пакінуў у маленстве, а потым вярнуўся. І пачуццё становіцца стымулам, каб зрабіць тут нешта. Каб быць часткай тутэйшага раю і не пакрыўдзіць нікога, нішто не парушыць у ім.

## НА ПЫТАННІ КОЖНАГА ЗНОЙДУЦЦА АДКАЗЫ

***— Які вы як кіраўнік, ці прытрымліваецеся нейкіх прынцыпаў, на што абапіраецеся, прымаючы важныя рашэнні?***

— Я маю свой стыль і прынцыпы, і яны вельмі простыя: старацца нікога не пакрыўдзіць, не крычаць на людзей. А таксама рабіць усё з разуменнем таго, што тая ці іншая справа вартая таго, каб быць зробленай. Самае галоўнае ў любой арганізацыі не тэхніка, а людзі. Яны павінны быць аб'яднаны адной ідэяй, стаць аднадумцамі. І іх трэба паважаць. Я нават да дысцыпліны вытворчасці стаўлюся так, што ты павінен зрабіць сваю працу. Недастаткова, каб ты прыходзіў у восем і сыходзіў з працы а шостай гадзіне. Мне важны вынік зробленага.

> **«Беларусы нічым не адрозніваюцца ад іншых народаў, якія жывуць у Еўропе. Наш народ хоча жыць у мірным, стабільным грамадстве».**

***— Чаго сёння, на вашу думку, не хапае беларускаму тэлебачанню?***

— Нашаму тэлебачанню крыху не хапае інтэрактыўнасці. І ў гэтым напрамку мы працуем. Кожны чалавек павінен разумець, што гэта яго тэлебачанне. І ён можа задаваць тыя пытанні, якія яго турбуюць, і на іх знойдуцца адказы. На пытанні і патрэбы кожнага гледача мы арыентуемся. І такім шляхам трэба ісці. Інтэрактыўнасць пакуль што нам не так проста даецца, хоць аўтарытэт кампаніі і кожнага канала, яго творчых адзінак, безумоўна, растуць. Але мне хацелася б узмацніць гэты поспех.

***— Давайце пагаворым пра надзённае. У нас ёсць сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3». Чаму ён не цалкам беларускамоўны?***

— Падмурак тэлеканала цалкам беларускамоўны: заставкі, «шапкі» і ўсё іншае. Уласнай вытворчасці праграмы таксама робяцца на беларускай мове, але калі мы купляем нейкія ўжо гатовыя фільмы, кантэнт, і ён перакладзены на рускую мову, то перакладу мы не робім. У нас у краіне двухмоўе. Рускую мову ўсе разумеюць, таму няма патрэбы нешта тлумачыць. Калі мы купляем венгерскае, напрыклад, кіно ці карэйскае, сербскае, то самі перакладаем на беларускую мову. Працэнт прысутнасці беларускай мовы на тэлеканале «Беларусь 3» будзе павялічвацца.

***— У свой час «чацвёртую кнопку» вы планавалі аддаць пад «сямейны тэлеканал», але з'явіўся «Беларусь 4» — рэгіянальнае тэлебачанне. Ці будзе працяг, ці з'явіцца ў нас тэлеканал для ўсёй сям'і?***

— Справа ў тым, што чацвёрты канал і ёсць сямейны, толькі называецца па-іншаму. «Беларусь 4» будзе менавіта такім хатнім тэлебачаннем, дзе тое, што адбываецца ў двары нейкага мікрараёна, становіцца прадметам цікавасці для журналістаў, для тых, хто робіць кантэнт тэлеканала. Хаця, безумоўна, там знойдзецца месца размове пра ўвесь свет, будуць на «Беларусь 4» рэгіянальныя навіны — эканамічныя, палітычныя, але іх будзе не шмат. Асноўнае напаўненне — акцэнт на сям'і, на жыцці рэгёна. Тэлеканал ужо працуе ў Магілёўскай, Гомельскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях, не запусцілі яго яшчэ толькі на Брэстчыне. Аднак на пачатку лістапада ён пачне вяшчаць і там. Хацелася б туды пад'ехаць і засведчыць заканчэнне гэтага працэсу фарміравання холдынга ва ўсіх яго нішавых падраздзяленнях.

***— Чым, на вашу думку, сёння жывуць людзі, што ім цікава?***

— Беларусы нічым не адрозніваюцца ад іншых народаў, якія жывуць у Еўропе. Наш народ хоча жыць у мірным, стабільным грамадстве. І насельніцтва ўдзячна, што мае такую магчымасць. Самае галоўнае жаданне, каб не было вайны. Народ жыве паляпшэннем якасці свайго жыцця. І марамі пра тое, каб не было горш. Стараецца працаваць на тое, каб было лепш. Нічога выключнага. Кожны жыве сваімі інтарэсамі, і самае галоўнае і вялікае шчасце, што яны могуць планаваць, марыць і спадзявацца на тое, што задуманае спраўдзіцца.

## ІМПРАВІЗАЦЫІ Ў «КЛУБЕ...» ПАКІДАЕМ МЕСЦА

***— Праграма «Клуб рэдактараў», у якой аналізуюцца бягучыя падзеі, існуе не першы год. На вашу думку, як змянілася яна за гэты час? Ваша ацэнка зробленай працы...***

— «Клуб рэдактараў» — вельмі патрэбная перадача, якая заняла сваю нішу. У яе ёсць свая аўдыторыя. Гэта аналітычная, менавіта рэдактарская, праграма, яна збірае для абмеркавання людзей, якія фарміруюць не ўласна самі навіны, а трэнды, тэндэнцыі, што з гэтых навін вынікаюць. Адштурхоўваючыся ад любой падзеі, можна выйсці на прагноз таго, што будзе. І калі збіраюцца ў «Клубе...» рэдактары, якія па сваёй пасадзе павінны арыентавацца ў тым, што адбываецца ў свеце, то, па-першае, вельмі цікава з імі абмяркоўваць карціну тыдня, а па-другое, выказванні іх часта бываюць даволі прарочымі. Бывае, нехта прадказвае пэўнае развіццё падзей. Праграма атрымалася. Што тычыцца ўдасканалення праекта, на мой погляд, мы павінны з'явіцца ў прамым эфіры. Зараз у нас проста не хапае студый, і ў гэты час яны ўсе занятыя. Аднак, я спадзяюся, што ўжо ў 2016 годзе праект «Клуб рэдактараў» пачне выходзіць у прамым эфіры. Гэта дысцыплінуе, прымушае больш адказна і канкрэтна выказвацца.

***— І як вы адчуваеце сябе ў ролі мадэратара на такой праграме?***

— Справа ў тым, што на праграму прыходзяць тытулаваныя журналісты, якія ўзначальваюць нашы выданні. Яны самі могуць адзін аднаму задаваць пытанні і быць мадэратарамі. І таму не ўзнікае ў працы ніякіх цяжкасцяў. Зразумела, што ёсць пэўны план праграмы, асноўныя пытанні, якія нам хочацца агучыць. Бывае, нехта з прысутных уздымае пэўную тэму, і мы яе пачынаем з цікавасцю абмяркоўваць з гасцямі. Імправізацыі пакідаем месца.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

■ Еўрабачанне-2016

# ПРАДСТАЎНІКА БЕЛАРУСІ ВЫЗНАЧАЦЬ ТЭЛЕГЛЕДАЧЫ

**Афіцыйны прадстаўнік нашай краіны ў міжнародным конкурсе песні «Еўрабачанне-2016» будзе вызначаны па выніках галасавання гледачоў падчас трансляцыі фіналу нацыянальнага адбору.**

Змену ў Палажэнні аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура міжнароднага тэлевізійнага конкурсу песні «Еўрабачанне-2016» на днях ухвалілі члены пастаянна дзейнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы да конкурсаў «Еўрабачанне». Пасяджэнне камітэта пад старшынствам міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова адбылося ў сценах Белтэлерадыёкампаніі.

Абмяркоўваючы асаблівасці сёлетняга нацыянальнага адбору, у тым ліку тыя, што датычацца галасавання, кіраўнік праекта «Еўрабачанне» ў Беларусі» Вольга Шлягер адзначыла: «выбар прадстаўніка для конкурсу з дапамогай галасавання гледачоў — гэта самая празрыстая форма ў плане вызначэння годнага прэтэндэнта».

Фіналісты, у сваю чаргу, будуць вызначаны прафесійным журы падчас праслухоўвання канкурсантаў. Зацверджанае аргкамітэтам Палажэнне аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура конкурсу песні «Еўрабачанне-2016» размешчана на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by 23 кастрычніка. Гэтая дата лічыцца стартам для прыёму заявак на ўдзел у адборы.

# АЎТОРАК, 27 КАСТРЫЧНІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «20 гадоў без кахання».**
**12.10 Серыял «Каханне — не бульба».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.55 Серыял «Чорныя кошкі».**
**16.30 Серыял «Чужы твар».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**00.45** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 15.45** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**10.05, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.00** «Зразумець і абяскшодзіць».
**12.00, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**12.55, 22.10 Серыял «Косці».**
**13.50, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 23.05** «Пін-код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**22.05** Спортлато 5 з 49. КЕНА.
**23.55** Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50, 11.40, 15.20, 18.30, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.00, 17.25 «Тры вясёлыя змены». Прыгоды. 1-я серыя.**
**9.05, 17.00** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Тры вясёлыя змены».
**9.35 «Чорная магія, ці Спатканне з д'яблам». Драма.**
**11.10, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы Зінаіды Браварскай.
**11.50 «Кароль Драздабарод». Фільм-казка.**
**12.55** М/ф.
**13.35 «Наш чалавек у Гаване». Камедыя.**
**15.30 «Трывогі першых птушак». Драма.**
**18.45 «Пастка для адзінокага мужчыны». Камедыя.**



**20.10, 23.10** «Дыя@блог». «Пра мову».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Лёс гігантаў». «Ікарус».
**21.30 «Царэвіч Аляксей». Драма.**

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Вынікі.
**7.30** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — ФК «Віцебск».
**9.20** Час футбола.
**10.00, 14.30, 22.45** Тэніс. Вынікі турнір ВТА. Сінгапур.
**12.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сандэрлэнд» — «Ньюкасл».
**14.00** Сучасное пяціборʼе. Кубак свету.
**16.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Слован».
**18.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**19.20, 22.35** PRO спорт. Навіны.
**19.30** Спорт-кадр.
**20.00** Змяшаныя адзінаборствы. Чэмпіянат Беларусі па грэплінгу. Фіналы.

**0.50** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Павук».**
**23.00 Камедыі «Лэдзі Поспех».**
**1.10** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Камедыя «Няўдачлівыя».**
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Ежа багоў».
**14.45, 23.40 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Цяжар багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.20** «Дакументальны праект»: «45 секунд да вечнасці».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 0.50 Маст. фільм «А Вы кахалі калі-небудзь?»**
**11.05 Маст. фільм «Дарога без канца».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 19.25 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20, 4.55** Іншы свет.
**16.50, 5.25** Зямля. Тэрыторыя загадак.
**17.20, 2.20 Серыял «Я яму веру!»**
**21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.05 Маст. фільм «Родная крывіначка».**
**23.45** Галоўная тэма.
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**4.00** Спецпраект «З нагоды».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.25, 0.00** «Золата для партыі. Баваўняная справа». «Следчы эксперымент. Тайна следу».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».**



**22.05, 23.10 Серыял «Каралева прыгажосці».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Новыя рускія сенсацыі».
**7.10, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20** «Лаліта».
**11.20 Серыял «Ляснік».**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцэйны».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Дэльта. Працяг».**
**21.25 Серыял «Чума».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.50 Серыял «Бездань».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.35 Серыял «Мушкецёры».**
**9.25, 12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.30, 19.30, 21.00** «Хатняя крама».
**9.35** Дак. экран.
**10.15** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер»-1.
**11.15 Трылер «Рыцары неба».**
**12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.30, 19.30, 21.00** «Хатняя крама».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Лавізна».**
**16.20** «Золата маўчання».
**16.40 Серыял «Радзіма».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Пералом».**
**23.20 Серыял «Нязломная Кімі Шміт».**

## ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** «Турбаміксер».
**8.30, 16.30** Серыял «Варонiны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 14.00, 20.00** Серыял «Кухня 5».
**11.00, 19.00** Серыял «Лонданград».
**12.00** Камедыя «Няўдачлівыя».
**15.00, 3.00** «Спатканне для мамы».
**16.00, 4.30** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Дзіця напракат».
**23.00, 2.30, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 5.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Выжыць пасля».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Як вам гэта спадабаецца». Маст. фільм.
**12.55** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.15** «Пятае вымярэнне».
**13.45** «Дуброўскі». Серыял. 1-я серыя.
**14.50** «Франц Фердынанд». Дак. фільм.
**15.10** «Рыгор Бакланаў пра Аляксандра Твардоўскага». Фільм 1-ы.
**15.40, 22.00** «Старажытны Егіпет — жыццё і смерць у Даліне Цароў». Дак. фільм.
**16.40** «Астравы». Ілья Фрэз.
**17.20** «Дваранскае гняздо».
**17.50** Валерый Гергіеў і Лонданскі сімфанічны аркестр. І. Брамс. Сімфонія №3 і Варыяцыі на тэму Гайдна.
**18.45, 23.00** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Гульня ў бісер». «Л. Талстой «Смерць Івана Ільіча».
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Як важна быць сур'ёзным». Маст. фільм.
**1.25** С. Рахманінаў. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам №2. ДСА «Новая Расія».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Гр. «Лицей». 1995 год.
**6.40, 8.00, 8.55, 11.10, 13.00, 15.40, 17.00, 18.55, 20.30, 21.40, 23.00, 0.45, 1.35, 5.20** Музычная настальгія.
**7.00** Канцэрт групы «Машина времени» і групы «Цветы».
**8.50** М/ф «Асцярожна — нервы!».
**10.00** Маст. фільм «Не плач, дзяўчо!».
**12.00** «СеваАлгія» з Севам Наўгародцавым: «Шоу-бізнес у СССР». 2005 год.
**13.15** Маст. фільм «А цяпер судзі».
**14.45** М/ф «Зязюля і шпак».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**19.20** Маст. фільм «Вертыкаль».
**20.45** М/ф «Палкан і Шаўка».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983. 2-я частка.
**1.05** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Аркадзь Райкін.
**2.45** М/ф «Няўмыйка».
**3.00** «Быў час». 2008 год.
**4.00** Маст. фільм «Адрас Вашага дома».

## EUROSPORT

**5.00, 8.30, 14.00, 22.15** Снукер. International Championship.
**6.05, 17.30** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**6.30, 18.00** Футбол. Веліч футбола.
**6.55, 18.25** Футбол. Еўрагалы.
**7.00, 18.30, 0.15** Футбол. Кубак свету. (U-17).
**12.30, 20.45, 3.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**1.00** Аўтаспорт. Формула Е.
**1.30** Акадэмія GT. Аўтаспорт.
**1.45** Матаспорт. Піт-стоп.
**2.45** WATTS!

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Любовь-морковь 2».
**8.25** Камедыя «Любовь-морковь 3».
**10.20, 17.45, 22.00** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
**10.50** Камедыя «Дыска».
**12.30** Камедыя «Два ў адным».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.05, 21.45, 0.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Пенелопа».



**18.45** Камедыя «Свята пад замком».
**20.20** Камедыя «Зануда».
**23.10** Камедыя «Шалёныя грошы».
**1.15** Камедыя «Кухня ў Парыжы».
**4.00** Камедыя «Востраў скарбаў».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.20, 18.45, 1.10** «Курт Сеіт і Аляксандра». Серыял.
**10.00, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.30, 17.50** «Тайны следства». Серыял.
**14.25** «Простыя складанасці».
**14.55** «Prокіно».
**15.05, 2.55** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50, 21.50** «Ганна Герман». Серыял.
**20.50, 0.25** «1943». Серыял.
**22.50** «Зорныя гісторыі».
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

## ТБ1000

**5.20** Фантастыка «Двухсотгадовы чалавек».
**7.30** Драма «Філамена».
**9.10** Прыгоды «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**10.50** Фантастыка «Уварванне».
**12.30, 3.10** Трылер «Сотавы».
**14.10** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**16.00** Трылер «Ілюзія падману».
**18.00** Драма «Змоўшчыца».
**20.00** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**22.00** Драма «Дыяна: гісторыя кахання».
**23.50** Драма «Бабёр».
**1.30** Камедыя «10 крокаў да поспеху».
**4.55** Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Белая птушка з чорнай меткай».
**8.00** Меладрама «Начной карчмы агеньчык».
**10.05** Дэтэктыў «Смяцяр».
**11.50** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**13.20** Драма «Падарожжа аўтастопам».
**15.10** Драма «Старэйшая жонка».
**16.55** Камедыя «Неваляшка».
**18.40** Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
**20.25** Казка «12 месяцаў. Новая казка».
**22.00** Камедыя «Каўказская палонная!».
**23.40** Баявік «22 хвіліны».
**1.05** Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
**2.50** Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
**4.30** Меладрама «Вы не пакінеце мяне».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 8.15, 16.50, 21.00, 1.10, 4.30** Гульні розуму.
**7.15, 13.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Код небяспекі.
**9.20, 13.30, 19.30** Злавіць кантрабандыста.
**10.10, 14.20, 20.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.40** Зрабі або памры.
**15.10** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.00** Зграя. Ільвы.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Чалавек супраць YouTube.
**18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.40, 2.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Ракавая стыхія.

## DISCOVERY

**8.00, 12.30, 22.00** Хуткія і гучныя.
**8.50** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Бітвы за кантэйнеры.
**11.35, 7.10** Рыбацкія легенды Якуба Вагнера.
**13.25, 6.25** Што было далей?
**15.15, 1.00, 5.35** Круты цюнінг.
**16.10, 23.00, 3.00** Махінатары.
**18.00** Рачныя монстры.
**19.00** Голыя і напалоханыя.
**20.00** Падарожжа ў невядомасць.
**0.00** Кубінскі хром.
**2.00, 4.50** Скарбы з кладоўкі.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Тэлесеткі

# СПАСЦІГАЕМ САКРЭТЫ ВЯЛІКАГА БІЗНЕСУ

**На тэлеканале АНТ з 23 кастрычніка стартуе новы праект «Мой бізнес». У першых трох выпусках тэлегледачы ўбачаць самыя яркія і арыгінальныя прэзентацыі ўдзельнікаў праекта. Галоўная мэта «Майго бізнесу» — паказаць, што кожны чалавек можа займацца сваёй справай. І пацвярджэннем таму будуць рэальныя прыклады людзей, якім будуць дапамагаць дасведчаныя эксперты. Вядучым рэаліці-шоу будзе Дзяніс Кур'ян.**




Пачатак новаму адукацыйнаму тэлевізійнаму праекту быў пакладзены яшчэ ў чэрвені 2015 года. Тады больш як 700 прадпрымальнікаў з розных куткоў Беларусі заявілі аб сваім жаданні стварыць ці ўдасканаліць сваю справу. Бізнесменам-пачаткоўцам і кампаніям была дадзена магчымасць асабіста прэзентаваць сваю ідэю. Па выніках папярэдніх адбораў у праекце засталіся 30 патэнцыяльна цікавых удзельнікаў. Аўтары найлепшых ідэй выступяць перад самымі паспяховымі бізнесменамі нашай краіны, якія ведаюць, як зарабляць грошы і кіраваць буйнымі кампаніямі.

Ментарамі праекта выступяць Алег Хусаенаў (генеральны дырэктар кіруючай кампаніі «Зубр Капітал»), Аляксандр Паліўка (намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк»), Аляксандр Кныровіч (кіраўнік групы кампаній «Сармат») і Дзяніс Цярэшчанка (кіраўнік дэпартамента маркетынгу СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»).

— Бізнес можна і трэба рабіць. І займацца ім у той краіне, дзе ты жывеш. Мне, напрыклад, вельмі цікава ўбачыць у праекце бізнес з глыбінкі, з розных абласцей і раёнаў Беларусі, — адзначыў Алег Хусаенаў.

Удзельнікі праекта ўжо зрабілі першы крок: прыйшлі расказаць «акулам» бізнесу пра свае ідэі, але толькі некаторыя з іх атрымаюць грошы на развіццё сваёй справы. Перад ментарамі праекта пастаўлена няпростая задача: з трох дзясяткаў удзельнікаў выбраць 8 прадпрымальнікаў з ідэямі, якія можна развіваць далей і якія будуць прэтэндаваць на галоўны прыз праекта. Па правілах праекта, кожны ўдзельнік павінен прэзентаваць сваю бізнес-ідэю, і калі хоць адзін з экспертаў скажа «так», то прэтэндэнт праходзіць у наступны тур. Тыя, чые ідэі здабудуць сабе месца ў запаветнай васьмёрцы найлепшых, атрымаюць грашовы ўклад на развіццё ў памеры 45 мільёнаў рублёў. І гэтыя ідэі будуць развівацца пры фінансавай падтрымцы і пад кіраўніцтвам вопытных бізнесменаў на вачах у шматлікай аўдыторыі тэлеканала АНТ. Толькі пры падтрымцы гледачоў у снежні вызначыцца пераможца праекта «Мой бізнес» — прадпрымальнік, які пройдзе ўсе этапы праекта, рэалізуе свой патэнцыял, атрымае самыя высокія ацэнкі экспертаў і заваюе сэрцы тэлевізійнай аўдыторыі.

Глядзіце з 23 кастрычніка па пятніцах на тэлеканале АНТ, як ідзі пераўтвараюцца ў бізнес!

**Алена ДРАПКО.**
drapko@zviazda.by

## СЕРАДА, 28 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «20 гадоў без кахання».**
**12.10 Серыял «Каханне — не бульба».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.45 Серыял «Чорныя кошкі».**
**16.30 Серыял «Чужы твар».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**00.30** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 16.00** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**10.15, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.10** Вось гэта дзіва!
**12.15, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**13.10, 22.10 Серыял «Косці».**
**14.05, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 23.05** «Пін-код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**23.55** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**0.55** Фэнтэзі «Усёмагутны Джонсаны».

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50, 11.25, 15.20, 18.15, 23.50** «Калейдаскоп».
**8.00, 17.10 «Тры вясёлыя змены». Прыгоды. 2-я серыя.**



**9.05, 16.40** М/ф.
**9.40 «Наш чалавек у Гаване». Камедыя.**
**11.40 «Пастка для адзінокага мужчыны». Камедыя.**
**13.10, 23.25** «Свята далёкай зоркі». Памяці акцёра і рэжысёра Дзмітрыя Арлова.
**13.35 «Царэвіч Аляксей». Драма.**
**15.35** «Кароль Драздабарод». Фільм-казка.
**18.30 «За што?» Драма (Расія-Польшча, 1995).**
**20.10, 22.55** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Лёс гігантаў». «Трабант».
**21.30 «Асенні марафон». Трагікамедыя.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.10** Спорт-кадр.
**7.35, 18.10** Козел пра футбол.
**7.55** Баскетбол. НБА. Чыкага — Клҳўленд.
**9.35** Сучаснае пяцібор'е. Кубак свету.
**10.00, 14.30, 23.30** Тэніс. Выніковы турнір ВТА. Сінгапур.
**12.00** Плаванне. Кубак свету. Токіа.
**16.30** Баскетбол. НБА. «Голдэн Стэйт» — «Нью-Арлеан».
**18.25** Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**18.55, 23.20** PRO спорт. Навіны.
**19.00, 21.40** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Металург» (Магнітагорск).
**21.50** Гандбол. SEHA-ліга. «Вардар» (Македонія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).

### АНТ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Павук».**
**23.00 Камедыя «Дрэнная медыцына».**
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Груз».**
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.40** «Ежа багоў».
**14.45, 23.20 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Межы рэальнасці».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Меладрама «Апошняе каханне на Зямлі».
**22.00** «Глядзец усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**1.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30, 0.50 Маст. фільм «Іншапланецянка».**
**11.05 Маст. фільм «Родная крывіначка».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 19.25 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20, 4.55** Іншы свет.
**16.50, 5.25** Зямля. Тэрыторыя загадак.
**17.20, 2.20 Серыял «Я яму веру!»**
**21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**



**22.05 Маст. фільм «Мегаполіс».**
**23.45** Галоўная тэма.
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**4.00** Спецпраект «З нагоды».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25** «Мутанты сярод нас». «За мяжой. Пад уладай ГМА».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.05, 23.10 Серыял «Каралева прыгажосці».**
**0.00** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Ты не паверыш!»
**7.10, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20** «Лаліта».
**11.20 Серыял «Ляснік».**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцейны».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Дэльта. Працяг».**
**21.25 Серыял «Чума».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.50 Серыял «Бездань».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 9.40, 12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.30, 19.30, 21.00** «Хатняя крама».
**8.35, 18.30 Серыял «Мушкецёры».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45** Дак. экран.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Пералом».**
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Лавізна».**
**16.15** «Золата маўчання».
**16.40 Серыял «Радзіма».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Баявік «Ліцэнзія на забойства».**
**23.35 Серыял «Нязломная Кімі Шміт».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** «Турбаміксер».
**8.30, 16.30** Серыял «Варонін».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 14.00, 20.00** Серыял «Кухня 5».
**11.00, 19.00** Серыял «Лондангард».
**12.00** Камедыя «Дзіця напракат».
**13.50** «Ералаш».
**15.00, 3.00** «Спатканне для мамы».
**16.00, 4.30** «Лаві момант».
**21.10** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**23.10, 2.30, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 5.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Навіны».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Як важна быць сур'ёзным». Маст. фільм.
**12.55** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.15** «Красуйся, горад Пятроў!» «Царскае Сяло. Екацярынінскі палац».
**13.45** «Дуброўскі». Серыял.
**14.50** «Франсіска Гоя». Дак. фільм.
**15.10** «Рыгор Бакланаў пра Аляксандра Твардоўскага».
**15.40** «Старажытны Егіпет — жыццё і смерць у Даліне Цароў». Дак. фільм.
**16.40** Да 115-годдзя з дня нараджэння акцёра. «Ён быў Рыжоў». Дак. фільм.
**17.20** «Дваранскае гняздо».
**17.50** Валерый Гергіеў і Лонданскі сімфанічны аркестр. І. Брамс. Сімфонія №4.
**18.35** «Вільгельм Рэнтген». Дак. фільм.
**18.45, 23.00** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Астравы». Сяргей Пускепаліс.
**22.00** Прыступкі цывілізацыі. «Раскрыццё тайн Вавілона». Дак. фільм. 1-я серыя.
**22.50** «Поль Гаген». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Шлях у вышэйшае грамадства». Маст. фільм.
**1.45** Г. Берліёз. Фрагменты драматычнай сімфоніі «Рамэа і Джульета».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Шоу-бізнес у СССР». 2005 год.
**7.00, 8.00, 9.40, 11.00, 13.00, 14.30, 15.40, 17.00, 19.00, 20.30, 21.40, 23.00, 0.45, 2.00, 2.55, 5.10** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «А цяпер судзі».
**8.45** М/ф «Зязюля і шпак».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**13.20** Маст. фільм «Вертыкаль».
**14.45** М/ф «Палкан і Шаўка».
**18.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Кай Метаў. 2008 год.
**19.15** Маст. фільм «Блудніца».
**20.45** М/ф «Песенька ў лесе».
**0.00** «Акулы пяра». Гр. «Лицей». 1995 год.
**1.00** Канцэрт групы «Машина времени» і групы «Цветы».
**2.50** М/ф «Асцярожна — нервы!»
**4.00** Маст. фільм «Не плач, дзяўчо!»

### EUROSPORT

**5.00, 8.15, 14.30, 22.15** Снукер. International Championship.
**6.00** Матаспорт. Піт-стоп.
**7.00** WATTS!
**7.15, 8.10** Футбол. Еўрагалы.
**7.20, 2.05** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**7.45, 2.30** Футбол. Веліч футбола.
**12.30** Акадэмія GT. Аўтаспорт.
**12.45** Аўтаспорт. Формула Е.
**13.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету ў велатрэку.
**16.30** Футбол. Кубак свету. (U-17).
**18.30, 20.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**21.45** WATTS! Спецыяльны выпуск.
**23.20** Усе віды спорту. Кампус.
**23.45** Спорт&Ко.
**23.50** «Спартыўныя прыгоды».
**0.00** «Выбар Лючыі».
**0.05** Конны спорт. ROYAL TOUR.
**0.35** Конны спорт. Кубак свету.
**0.45** «Час скачак».
**0.50** Гольф. Еўратур.
**1.15** Гольф-клуб.
**1.20** Парусны спорт.
**1.55** Яхт-клуб.
**4.00** Футбол. MLS. Плэй-оф.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.20, 9.55, 17.40, 22.00** Серыял «Нумар адзін спадар Хкан».
**6.50** Камедыя «Любовь-морковь 3».
**8.25** Камедыя «Два ў адным».
**10.55** Меладрама «Пенелопа».
**12.40** Камедыя «Свята пад замком».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 21.45, 0.50** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Шалёныя грошы».
**18.45** Камедыя «Зануда».
**20.20** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**23.10** Меладрама «Удачы, Чак».
**1.15** Камедыя «Дыска».
**4.00** Камедыя «Кухня ў Парыжы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.20, 18.55, 1.15** «Курт Сеіт і Аляксандра». Серыял.
**10.10, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.00, 4.20** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.50** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.45, 18.00** «Тайны следства». Серыял.
**14.40** «Простыя складанасці».
**15.10, 2.50** «Нераскрытыя тайны».
**16.10** «Мой герой».
**17.00, 21.50** «Ганна Герман». Серыял.
**20.50, 0.30** «1943». Серыял.
**22.50, 5.10** «Зорныя гісторыі».
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.50** Фантастыка «Уварванне».
**8.45** Камедыя «Аналізуй гэта».
**10.30** Драма «Таемная цяга».
**12.20** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**14.15** Трылер «Стоўн».
**16.00** Драма «Самы блізкі сябар».
**17.45** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**20.00** Меладрама «Яна».
**22.10** Драма «Паганіні: скрыпач Д'ябла».
**0.10** Фэнтэзі «Выдатныя стварэнні».
**2.20** Камедыя «Аналізуй гэта».
**4.05** Камедыя «Той самы чалавек».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Доўгія праводзіны».
**8.05** Прыгоды «Скарбы О.К.».
**10.05** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**11.50** М/ф «Бабай».
**13.20** Трылер «Вій 3D».
**15.40** Камедыя «М+Ж».
**17.10** Камедыя «Звычка расставацца».
**18.40** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**20.20** Драма «Кіно пра Аляксеева».
**22.00** Драма «Люстэркі».
**0.20** Камедыя «З 8 сакавіка, мужчыны!»
**2.20** Драма «Гульні матылькоў».
**4.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 8.15, 13.30, 19.20** Гульні розуму.
**7.15, 13.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Код небяспекі.
**10.10, 14.20, 20.10** Чалавек супраць YouTube.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50, 16.50, 21.00, 1.10, 4.30** Шаша праз пекла.
**12.40** Зрабі або памры.
**15.10** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.00** Зграя. Гіенавыя сабакі.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Ледзяная дарога.
**18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.40, 2.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Ракавая стыхія.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Круты цюнінг.
**8.50** Што было далей?
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Скарбы з кладоўкі.
**11.35, 7.10** Востраў.
**13.25, 6.25** Глядзі ва ўсе вочы.
**15.15, 5.35** Дарога да прыбытку.
**16.10, 20.00, 3.00** Махінатары.
**18.00** Кубінскі хром.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**22.00** Склады.
**23.00** Акулы аўтатаргоў з Далаca.
**0.00** Гаражнае золата.
**1.00** Бітвы за кантэйнеры.
**2.00, 4.50** Багажныя войны.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на

**АВЕН.** У першай палове тыдня вы можаце сутыкнуцца не толькі з неразуменнем з боку іншых людзей, але і з адкрытай варожасцю, супрацьстаяннем вам і вашым жаданням. Матывы іншых людзей будуць вам далёка не заўсёды зразумелыя. Старайцеся дзейнічаць у рамках сваёй кампетэнцыі, прытрымлівацца вызначанага парадку — і будзеце адчуваць сябе значна больш упэўнена, чым калі паспрабуеце хітрыць і шукаць выгады для сябе не самым сумленным чынам. Напрыканцы тыдня сітуацыя стане больш спакойнай.

**ЦЯЛЕЦ.** Давядзецца знайсці адзінае правільнае рашэнне і парадак дзеянняў, які дазволіць урачаважыць супрацьстаянне, як па-за вамі, так і ўнутры вас. Магчыма, вас наведаюць розныя ідэі, або жаданні будуць супярэчыць адно аднаму. Гарманічна аб'яднаць іх ці выбраць нешта адно — ваша задача для пачатку тыдня. Другая ж яго палова будзе прысвечана планамернаму, але пры гэтым вельмі імкліваму ажыццяўленню задуманага. У канцы тыдня вы будзеце асабліва рашучыя і непахісныя, што дазволіць зламаць любы знешні супраціў на шляху да вашай мэты.

**БЛІЗНЯТЫ.** У першай палове тыдня вы будзеце занадта актыўныя і дзелавітыя. Вядома, у які-небудзь іншы раз гэта было б нядрэнна: вы маглі б раздаваць усім указанні, прымаць удзел у розных працэсах і ўсюды праявіць сябе. Але на гэтым тыдні становішча выглядае крыху інакш. Вашай унутранай энергіі і жаданню паказаць сябе не будзе знойдзена прымянення. Кантакты з іншымі людзьмі выглядаюць вельмі сумнiўна, ніхто не ўспрымае вас усур'ёз, не плануе весці з вамі якія-небудзь дыялогі. Таму вам лепш паберагчы сілы і накіраваць іх у іншае рэчышча.

**РАК.** Тыдзень будзе вельмі знамянальны, яго падзеі могуць літаральна перавярнуць ваша жыццё з ног на галаву або назад, калі да гэтага вы займалі падвешанае, застойнае становішча. Падзеі пачнуць развівацца больш актыўна, і вы зможаце прыняць ва ўсім гэтым самы прамы ўдзел. Праявіце актыўнасць і мэтанакіраванасць, не бойцеся перамен, не сядзіце на месцы і тым больш не адступайце назад. Вельмі хутка заўважыце, што ўсё атрымліваецца, і вы трапілі, як той казаў, у струмень. Асабліва спрыяльна выглядае другая палова тыдня.

**ЛЕЎ.** Тыдзень добры для прасоўвання па службе, прывядзення ў парадак спраў, дасягнення пастаўленых перад сабой задач, асабліва ў матэрыяльнай сферы. Давядзецца пазмагацца за сваё месца пад сонцам. У пачатку тыдня не ўсё ў вашым жыцці будзе гладка. Асноўнай прычынай рознагалоссяў і спрэчак будуць вашы новыя ідэі і жаданні, якія, тым не менш, варта ажыццявіць. Бліжэй да канца тыдня вы ўсё ж атрымаеце верх, што абяцае вельмі добрую перспектыву ў любых пачынаннях.

**ДЗЕВА.** Ваша актыўнасць у пачатку тыдня прынясе пэўны плён. Ёсць шанц змяніць свой лёс, накіраваць яго ў іншае рэчышча. Тут вельмі важна дзейнічаць па загадзе сэрца. Хоць знешне ваш выбар здаецца і няправільным, толькі сэрца і ўнутранае адчуванне дазволяць зрабіць той выбар, які прывядзе да дабрабыту. Змена падзей, розныя шляхі могуць вас спалохаць, але, калі будзеце дзейнічаць рашуча, а сілы для гэтага ў вас ёсць, то зможаце дасягнуць неабходнага выніку.

■ Учора — сёння

# МЫ Ў БУДУЧЫНІ

**Вытворца спартыўнага адзення і абутку кампанія Nike паведаміла, што красоўкі Nike Mag, галоўнага героя фільма «Назад у будучыню 2», якія самі зашнуроўваюцца, зноў могуць паступіць у продаж вясной 2016 года.**

Нагадаем, што арыгінальныя красоўкі для фільма «Назад у будучыню 2» (у якім галоўны герой Марці Макфлай трапляе ў будучыню — у 21 кастрычніка 2015 года) у 1989 годзе былі створаны дызайнерам Nike Цінкерам Хэтфілдам. Ён выказаў здагадку, што менавіта так будзе выглядаць абутак у 2015 годзе, у які нечакана закінула Марці. Праз 15 гадоў пасля выхаду культавага фільма прыхільнікі ўгаварылі аўтара цуд-абутку стварыць яго рабочы варыянт. Хэтфілд разам з дызайнерам-інаватарам Ціфані Бірс шэсць гадоў працавалі над праектам, і ў 2011 годзе Nike нарэшце выпусціла першую партыю красовак, якія самі замацоўваюцца на нагзе, з падсветкай і касмічным дызайнам. 1500 асобнікаў было прададзена з даброчыннага аўкцыёну, сродкі з якога былі накіраваны ў фонд даследаванняў хваробы Паркінсана, заснаваны Майклам Джэем Фоксам, які сыграў ролю Марці. І вось у 2015 годзе Nike падрыхтавала абноўленыя красоўкі.


У кіно ў 1989-м...


...У жыцці ў 2015-м.

Напярэдадні першая пара новай мадэлі была падорана стваральніку вобраза Марці Макфлая. Колькі будзе выпушчана красовак да новага аўкцыёну, не ўдакладняецца. Але вядома, што ўсе сродкі з яго зноў будуць накіраваны ў фонд Фокса. У культавага акцёра хвароба Паркінсона была дыягнаставана праз два гады пасля выхаду фантастычнай трылогіі.

## Было — стала

У канцы 1980-х аўтары трылогіі паспяхова прадбачылі з'яўленне многіх рэчаў к сённяшняму дню. Напрыклад, электроннага дзвярнога замка са счытваннем адбіткаў пальцаў. Таксама прадбачылася практычна ўсё, што тычыцца тэлебачання і сувязі, прычым сёння гаджэты значна хутчэйшыя і меншыя, чым у кіно.

Электроннае кіраванне домам у нашы дні таксама актыўна развіваецца ў рамках канцэпцыі дынстанцыйнага кіравання рэчамі. Рэальнасцю стала і шырокае распаўсюджванне дронаў. У фільме Марці аслупянеў, убачыўшы, як робат выгульвае сабаку. Яшчэ цэлы шэраг тэхнічных прадказанняў з трылогіі «Назад у будучыню» навукоўцы і інжынеры з той ці іншай ступенню поспеху спрабуюць сёння ўкараніць у жыццё. У іх ліку, уласна, і вышэйзначаныя красоўкі. Разумнае адзенне на планеце таксама ўжо існуе, але ў адзінкавых асобніках. Акрамя таго, актыўна развіваецца ідэя атрымання паліва з адходаў, у першую чаргу біялагічных. Трохмерны малюнак у кіно даступны ўжо амаль ва ўсіх кінатэатрах, але з трохмернымі галаграфічнымі копіямі пакуль праблемы.

Ну і, напэўна, самая дзіўная канструкцыя з фільма — левітуючы ховерборд у выглядзе дошкі для скейтборда, якая лунае над самай зямлёй — пакуль усё яшчэ далёкі ад ажыццяўлення. Многія вытворцы браліся за гэты праект, але пакуль толькі Lexus падрыхтаваў версію, якая трымаецца ў паветры (праўда, толькі над спецыяльнай магнітнай трасай).

# НЯДЗЕЛЯ, 1 ЛІСТАПАДА

## БЕЛАРУСЬ 1

**7.10 Меладрама «Развітанне». 1—2-я серыі.**
8.50 Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Урачыстасць усіх святых і Дзень памінання памерлых.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.40, 0.40 Серыял «Як выйсці замуж за мільянера-2».**
10.40 «50 рэцэптаў першага».
11.20 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.10 Нашы.
13.40 Каробка перадач.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
**15.30 Меладрама «Вар'яцкі юбілей».**
**17.30 Меладрама «Сон як жыццё». 1—2-я серыі.**
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Клуб рэдактараў.
22.35 Навіны надвор'я.
**22.55 Меладрама «Берагі кахання».**
**23.25 Трылер «Прывіды». Заключная серыя.**
**0.30 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

## БЕЛАРУСЬ 2

7.05 М/с «Сябры анёлаў». Італія.
**8.10 Серыял «Шчаслівыя разам». Заключныя серыі.**
10.00 «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
11.00 Хачу ў тэлевізар!
11.15, 20.05 Тэлебарометр.
11.20 Ваша лато.
11.50 Пяцёрачка.
12.05 «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.35 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**14.40 Камедыя «Людзі ў чорным 3».**
**16.35 Трылер «Анёлы і Дэманы».**
19.15 Суперлато.
20.40 Кіпець.
**21.10 Дэтэктыў «Метад Фрэйда». Заключныя серыі.**
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНА.

## БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.00, 15.20, 18.15, 0.25 «Калейдаскоп».
8.10, 12.10, 15.30, 18.30, 0.35 «Размовы пра духоўнае».
**8.25, 22.00 «Нестар Бурма». Серыял.**
9.50 «Прыватны візіт у нямецкую клініку». Прыгоды.
12.25 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Уладзімір Карачэўскі.
13.05 «Наперад у мінулае».
13.30 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
14.25 «Справы фамільныя». «Добрушская папяровая фабрыка».
14.50 «Музеі Беларусі». Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі і рэлігіі.
15.40 «Гітара па крузе». Дуэт Ніна Тарасава і Алена Хомская, дыпламанты Усерасійскага конкурсу эстрадных выканаўцаў.
**16.45 «Пракажоная». Меладрама.**
**18.40 «Пачуццё». Драма.**
20.40 «Калыханка».
21.00 «Анастасія Валачкова. «Нерв». Шоу ў Крамлёўскім палацы з'ездаў.
23.25 Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Яна не стала каралевай». Дак. фільм

## БЕЛАРУСЬ 5

7.30 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «Белшына» (Бабруйск).
9.20 Баскетбол. НБА. «Нью-Арлеан» — «Голдэн Стэйт».
10.55 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Чырвоны Кастрычнік» — «Цмокі» (Мінск).
12.35 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
13.00 Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
13.30 Тэніс. Выніковы турнір ВТА. Сінгапур. Фінал.
15.30 Піт-стоп.
15.55 Гандбол. SEHA-ліга. БГК імя Мяшкова — «Нексе».
17.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
18.25 Авертайм.
18.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгэмптан» — «Борнмут».
21.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Сандэрлэнд».
23.15 PRO спорт. Навіны.
23.30 Баскетбол. НБА. «Бостан» — «Сан-Антоніа».

## АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.15 «Брэйн-рынг».
12.30 «Разам з дэльфінамі».
**14.20 Камедыя «Тры плюс два».**



16.15 Навіны спорту.
16.20 «Аляксандр Градскі. Абярніцеся!»
**17.25 Драма «Люстэркі».**
20.00 Контуры.
21.05 «Голас».
23.20 «Што? Дзе? Калі?». Фінал восеньскай серыі.
0.40 Толькі для дарослых. Трылер «Метад». Сеанс другі.

## СТБ

**6.30 «Афрамасквіч». Серыял.**
7.20 «Скардзіцца дазваляецца».
7.40, 16.50 «Аўтапанарама».
8.05 Маст. фільм «Пасланне ў бутэльцы».
10.15 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 6». Серыял.**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 23.55 Маст. фільм «Вікторыя і Альберт». 2-я серыя.**
15.25 «Вадзіць па-руску».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Квартэт».**
22.10 «Апошнее прароцтва святой Матроны».
1.30 «Дакументальны праект»: «Спадчыннікі д'ябла».

## МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
**6.55 Маст. фільм «Акселератка».**
8.35 «Ведаем рускую».
9.30 «Нітка да ніткі».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Чаму я?»
**10.45 Серыял «Белы наліў». 1—4 серыі.**
**14.15 Маст. фільм «У краіне жанчын».**
**16.15 Серыял «Аляксандраўскі сад».**
21.00 «Разам».
**22.00 Серыял «Аляксандраўскі сад»-2.**
**0.40 Серыял «Валандэр».**
3.25 Спецпраект «З нагоды».
**4.20 Маст. фільм «Маё каханне».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Цана кахання».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 М/ф.
14.15 «Расія. Геній месца». Санкт-Пецярбург.
15.10 «Пакой смеху».
15.50 Яўген Петрасян — «Усмешка даўжынёю ў жыццё». Да 70-годдзя артыста.
18.00 «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Простая дзяўчына».**
0.20 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.10 «Астрапрагноз».
**6.15, 8.20 Дэтэктыў «Адвакат».**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Ўрачэбныя тайны плюс».
9.25 «Ядзім дома».
10.25 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
**13.20, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
17.05 «Следства вядуць...»
18.00 «Акцэнты тыдня».
18.55 «Кропка».
**19.45 Серыял «Мянтоўскія войны».**
23.10 «Прапаганда».
23.40 «Уцекачы з ІГІЛ».

## 8 КАНАЛ

9.00, 14.30, 19.00, 23.30 «На двор'е».
9.05 «Мультпарад».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 14.20, 16.10, 20.55 «Хатняя крама».
10.45 Прыгоды «Парыжскія тайны».
**12.30 Драма «Прысяжныя».**
14.35 М/ф.
**16.40 Серыял «Каломба».**
18.00 «Хобі+ТВ». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05 Драма «Прэзумпцыя віны».**
20.45 «Вечарніца».
**21.00 Драма «Гісторыя аднаго забойцы».**

## ВТБ

6.00 «Хатняя кухня».
6.30 «Вялікая маленькая зорка».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
7.45 М/ф «Маша і мядзведзь».
8.00 «Ералаш».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 1.00 «Турбакіксер».
12.00 Серыял «Апошні з Магікян».
13.30 «Паспець за 24 гадзіны».
14.30 «Жанаты з першага погляду».
15.30 «Дзікія гульні».
16.30, 22.50, 4.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
16.45 Прыгоды « Мушкецёры».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Меладрама «Дарагі Джон».
23.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Кіно ў дэталях».
3.30 «Лаві момант».
4.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
5.00 Серыял «Сваці».

## КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
12.05 «Яўген Самойлаў». Дак. фільм.
12.45 «Хто там...».
13.15, 0.40 «Азорскія астравы: акулы, кіты, скаты». Дак. фільм.
14.05 Геніі і злодзеі. Мікалай Міклуха-Маклай.
14.35 «Табу. Апошні шаман». Дак. фільм.
15.05 Да 115-годдзя з дня нараджэння Лідзіі Русланавай. «Больш, чым каханне».
15.45 «Пешшу...». Масква Шэхцеля.
16.15 Рудольф Бухбіндэр, Зубін Мета і Венскі філарманічны аркестр у канцэрце «Летнім вечарам у палацы Шонбрун».
17.50, 1.55 «Шукальнікі». «Справа фальшывыманетчыкаў».
18.40 «Рамантыка раманса». Сяргей Захараў.
19.40 Да юбілею кінастудыі імя М. Горкага. «100 гадоў пасля дзяцінства».
19.55 «Тры тапалі на Плюшчысе». Маст. фільм.
21.15 Паслухайце! «Паэты на Чырвонай Пахры».
22.40 Кіно на ўсе часы. «Карабалет». Маст. фільм.
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983.
6.40, 8.30, 9.40, 11.00, 13.00, 13.40, 15.40, 17.40, 18.40, 19.35, 20.55, 23.25, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.00 Маст. фільм «Гарадскі раманс».
8.45 М/ф «Някемлівы верабей».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
13.00, 19.00 «Смяцца, саправіды, не грэх...»
14.15 М/ф «Пунсовая кветачка».
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Майстэрства жыць у Адэсе».
18.00 «Акулы пяра». Ірына Салтыкова. 1996 год.
20.00 Канцэрт групы «Аліса». Рок-фестываль у Ленінградзе. 1988 год.
21.30 Маст. фільм «Дзікае каханне».
0.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Сяргей Нікіцін. 2008 год.
1.05 Маст. фільм «Куды ён дзенецца».
2.45 М/ф «Чаму ў елачкі калючыя іголачкі».
4.00 «Народжаныя ў СССР».

## EUROSPORT

5.00 Снукер. International Championship.
6.00 Аўтаспорт. Серыя World Endurance.
12.15 Аўтаспорт. Серыя WTCC.
14.30 Снукер. International Championship. Фінал.
17.30 Марафон. Нью-Ёрк.
20.00 «Час скачак».
20.05 Конны спорт. Кубак свету.
20.55 «Перавага коней».
21.00, 23.00, 1.00, 3.00 Футбол. MLS. Плэй-оф.

## КАМЕДЫЯ

6.00, 9.50, 2.55 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
7.00 Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
8.25 Меладрама «Нерэальнае каханне».
10.50 Камедыя «Горка».
12.35 Камедыя «Той яшчэ Карласан!»



14.00 Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
16.00 Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
17.40, 22.00 Серыял «Прападобны».
18.40 Камедыя «Сямейны план».
20.20 Камедыя «Вялікі Джым».
23.10 Камедыя «Модная штучка».
0.55, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
1.15 Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».
4.00 Меладрама «Удачы, Чак».

## ТБ3

6.00 М/ф.
9.25 «Дачныя гісторыі».
9.50, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
10.45 «Паненка і кулінар».
11.20, 0.55 «Каменская». Серыял.
14.45 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.05 Меладрама «Будзе светлым дзень».
19.25 «Без падману».
20.10 Трылер «Пачатак».
22.55 «Асцярожна, махляры!»
23.25 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
3.55 «Тайны двайнікоў». Дак. фільм.

## ТБ1000

6.20 Драма «Я — Сэм».
8.40 Драма «1+1».
10.40 Меладрама «Яна».
13.00 Трылер «Брудныя гульні».
15.10, 1.25 Фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень».
17.50, 4.00 Баявік «Прывідны гоншчык».
20.00 Драма «Прынцэса Манака».
21.45 Меладрама «Бурлеск».
23.45 Драма «Галгофа».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Люстэркі».
8.50 М/ф «Тры волаты на далёкіх берагах».
10.20 Камедыя «Калачы».
11.50 М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».
13.20 Камедыя «Карпаратыў».
14.50 Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
16.30 Драма «Арда».
18.40 «Што ў Сенькі было».
20.20 Баявік «22 хвіліны».
22.05 Трылер «Мужчынскі сезон: Аксамітная рэвалюцыя».
0.05 Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
2.00 Меладрама «Вы не пакінеце мяне».
4.10 Драма «Папса».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Мегазаводы.
6.50 7.40 Папулярная навука.
7.15, 8.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Зрабі або памры.
9.20 Асуышчь акіян.
10.10 Голая навука.
11.00 Навука будучыні.
11.50 Космас. Прастора і час.
12.40 Супербудаванні.
13.30 Нацыская падводная лодка.
14.25 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
15.10 Ласасёвыя войны.
16.00 Дзікая прырода Амерыкі.
16.50, 18.30 Крытычная сітуацыя.
17.40 Падарожжа фатографа па Вялікім кітайскім канале.
19.20 Сучасныя расследаванні.
20.10 Катастрофа ў рэальным часе.
21.00, 1.10, 4.30 Погляд знутры.
21.50, 2.00, 5.15 Наступнае мегацунамі.
22.40 Найгоршае надвор'е ў гісторыі?
23.30, 2.50 Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
0.20, 3.40 Карставыя варонкі.

## DISCOVERY

8.00 Склады.
8.50 Рыбацкія легенды
9.45 Рачныя монстры.
10.40 Падарожжа ў невядомасць.
11.35 Як уладкаваны Сусвет.
12.30 Космас навыварат.
13.25, 4.50 Плутон.
14.20, 22.00 Лепшыя ў сваёй справе.
15.15, 23.00 Разбуральнікі легенд.
16.10, 0.00 Трой.
17.05, 1.00, 3.00, 5.35 Хуткія і гучныя.
20.00 Буйны ўлоў.
21.00 Мяцежнікі ледзяного возера.
2.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
4.00 Голыя і напалоханыя.

■ Працяг тэмы

# ВАРТАСЦЬ ДЗІЦЯЧАЙ СЛЯЗІНКІ

**Гора-«маці» разам з сужыцелем, біялагічным бацькам чацвярых з пяці народжаных ёю дзяцей, атрымалі заслужанае пакаранне. Гомельскі абласны суд вынес прыгавор па справе, аб якой мы пісалі 08.09.2015 (http://zviazda.by/2015/09/99753.html) у нарысе «Ні сабе, ні людзям...». Цяпер — пра фінал рэзананснай трагедыі.**

*Мая знаёмая, якая працуе настаўніцай у школе, кажа, што сёлета ўпершыню за 20 гадоў работы ў межах так званага «ўсеабуча» абыходзіла кожную кватэру напярэдадні 1 верасня. Да таго ж патрабавала фізічнага прад'яўлення дзяцей. Да гэтага звычайна проста тэлефанавала бацькам і ўдакладняла — хто ў сям'і пойдзе ў школу ці садок.*

Такія меры перасцярогі пачалі праводзіцца ва ўсіх установах адукацыі Гомельшчыны пасля жудаснай гісторыі, якая ўскалыхнула ўсю краіну ў студзені. Трагедыя мае працяг — у выглядзе прысуду дваім сужыцелям, якія забілі (ці пакінулі) сваю трохмесячную дачку і пайшлі бадзяцца ў невядомым накірунку. Пакуль вандравалі, нарадзілі ў снежні наступнае дзіця, якое кінулі ў пад'ездзе шматпавярхоўкі. Хлопчыка, на шчасце, падабралі і ўжо ўсынавілі. Пад апекай бабулі знаходзяцца трое першых дзяцей 32-гадовай біялагічнай маці.

На першых допытах біялагічныя бацькі прызнаваліся, што мужчына задушыў дзяўчынку ў парыве злосці. Быццам з-за таго, што «дзіцячыя» грошы сужыцелька аддала не яму, а бабулі.

Аднак за восем месяцаў, пакуль малюсенькае цельца знаходзілася ў замкнутай кватэры, яно ператварылася ў мумію. Астанкі ў такім выглядзе не пакінулі судмедэкспертам шанцаў знайсці ўнутраныя органы, а значыць, і даказаць факт удушэння, адзначыў **галоўны дзяржаўны судова-медыцынскі эксперт па Гомельскай вобласці Дзмітрый ІВАНЬКОЎ.**

Відаць, таму на судзе грамадзяне раптам сталі прытрымлівацца версіі, што кінулі дзяўчынку паміраць адну ў кватэры, а самі пайшлі пачынаць жыццё «з чыстага ліста».

Пра яго чысціню можна спрачацца, але ж ці магчыма было прадухіліць гібель немаўляці? Адказ на гэтае пытанне шукалі ўсе — пракуратура, следства, міліцыя, інспекцыя па справах непаўналетніх, адукацыя і ахова здароўя... У ходзе расследавання і праверак высветлілася, што на пярвічным узроўні практычна ва ўсіх адказных супрацоўнікаў знайшлі дробныя парушэнні, якія непасрэдна не маглі б папярэдзіць смерць дзяўчынкі, але ж неяк паўплываць на сітуацыю вакол канкрэтных асацыяльных асоб маглі.

Напрыклад, патранажныя мядсёстры, якія прыходзілі ў кватэру, дзе была зарэгістраваная гора-матуля, пакідалі запіскі або прасілі бабулю перадаць сваёй дачцэ, што яе з чацвёртым дзіцём чакаюць у паліклініцы на прышчэпкі.

Не запатрабавалі фізічнага прад'яўлення нованароджанай і сацыяльныя педагогі, якія прыйшлі на кватэру маці ў жніўні 2014 года, каб правесці ўлік дзяцей. Тым не менш па выніках свайго наведвання склалі адпаведны акт. Афіцыйна зафіксавана, што ўсе дзеці жывыя-здаровыя. Труп Сняжаны на той момант ужо тры месяцы знаходзіўся ў замкнутай кватэры бацькі.

Высветлілася і тое, што ў радзільні, куды з вуліцы з пятым паступіла парадзіха без дакументаў, паверылі ёй на слова, запісалі яе і нованароджанага пад чужым прозвішчам. Калі пераводзілі ў абласную бальніцу, таксама не запатрабавалі пашпарт, і маці з дзіцем былі выпісаны з несапраўднымі даведкамі.

Дарэчы, гаворыць **памочнік пракурора Гомельскай вобласці па справах непаўналетніх і моладзі Вера ЗАМОЙСКАЯ,** цяпер медыкі ёй тэлефануюць у кожным сумніўным выпадку — каб параіцца. Такім чынам можна сказаць, што грамадскі рэзананс вакол трагедыі моцна ўзрушыў адказных асоб на нефармальнае выкананне сваіх абавязкаў. Хто па сумленню, хто са страху за сваю кар'еру, але ж усе зрабілі высновы на будучыню.

— Галоўная зробленая выснова — трэба даходзіць да кожнай сям'і. Таму ў вобласці больш актыўна праводзіцца работа па выяўленні дзяцей у сацыяльна-небяспечным становішчы. На Гомельшчыне такіх зараз амаль 4900. Летась было 3100. Таксама больш актыўна прымяняецца дэкрэт №18 у плане адабрання дзяцей — сёлета ад біялагічных бацькоў адабрана больш за 500. Мера апраўданая. Гэта не пазбаўленне бацькоўскіх правоў, а прафілактычная работа з праблемнымі матулямі і татамі. Ім такім чынам даюцца шанц і час асэнсаваць свае паводзіны, адказнасць за дзяцей і вярнуць бацькоў у сям'ю. Дарэчы, сёлета на Гомельшчыне паказчык вяртання адабраных па дэкрэце дзяцей вырас да 63,8%.

Між тым ёсць рэчы, на якія не паўплываюць ніякія інструкцыі. Гэта тычыцца, напрыклад, рэакцыі суседзяў па шматпавярховым доме, дзе на працягу васьмі месяцаў у кватэры на другім паверсе ляжаў труп дзяўчынкі. Многія пра трагедыю ўвогуле нават не чулі. Або казалі мне нешта накшталт: «А што я буду скардзіцца на гэтага ідыёта ў міліцыю, ён і мяне прыб'е бы».

У якасці пацярпелай на судзе праходзіла бабуля забітай дзяўчынкі. Яна многа разважала пра тое, што яе асуджаная дачка заўсёды прыгожа хлусіла, і ўсе вакол ёй верылі. Між тым сама бабуля на працягу васьмі месяцаў, пакуль не выкрылася ўсё, упэўнена расказвала байкі медыкам, сацыяльным работнікам, псіхолагам, педагогам і праваахоўнікам. Казала, што яе дачка з унучкай знаходзяцца недзе ў нармальных умовах. І ёй таксама верылі.

Можна, кажуць асобныя, зразумець немаладую жанчыну, загнаную ў кут паводзінамі дачкі з гора-зяцем. Да свайго знікнення яны такія «канцэрты» ладзілі, што ёй проста забыцца хацелася, калі іх раптам не стала побач. Але ж, колькі вяровачцы не віцца, хлусня, абцяжараная забойствам, усё роўна на свет вылезла.

Апошнія словы «матулі» было кароткім. Яна папрасіла не караць яе настолькі строга, як гэтага патрабаваў пракурор:

— Я прызнаю, што пакінула дзяцей. Не трэба было гэтага рабіць. Цяпер я ўсё разумею. Калі ласка, не судзіце мяне строга.

— Я прашу вас судзіць мяне за тое, што я ўчыніў, — гэтыя словы 36-гадовы гора-бацька чытаў па паперцы без усялякіх эмоцый на твары. — І прашу прабачэння. У каго — ены ведаюць.

Прысуд: 19 гадоў кожнаму з бацькоў забітай Сняжаны. За забойства загадзя малалетняга, які знаходзіўся ў бездапаможным стане, здзейсненае з асаблівай жорсткасцю групай асоб. Мужчыну, які будзе адбываць свой тэрмін у калоніі строгага рэжыму, яшчэ прымусяць лячыцца ад алкагалізму.

Ці адпавядае пакаранне здзейсненаму злачынству? Акрамя чалавечага суда, ёсць яшчэ і суд вышэйшы, які не дае права на апеляцыю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



**Фота аўтара.**

***P.S.** Дарэчы, у Гомелі пачаўся суд над іншай жанчынай, якая ўтапіла дваіх сваіх дзяцей у ванне. Гэты працэс будзе адбывацца ў закрытым рэжыме па просьбе абвінавачанай і яе адваката. Устаноўлена, што ў момант забойства жанчына не знаходзілася ў стане афекту, магла ўсведамляць характар сваіх дзеянняў і кіраваць імі*

■ Неасабісты суб'ектыў



# САКРЭТ ВЫЖЫВАННЯ

## Чаму людзям варта павучыцца ў непажаданых відаў жывёл

ЦІ ВЕДАЕЦЕ вы, як зімуюць янотападобныя сабакі? Аказваецца, у адрозненне ад сваіх «сваякоў» — ваўкоў ды лісаў, яны ўпадаюць у спячку. Прычым спяць у сваёй нары выключна парамі, як засведчылі відэазапісы біёлагаў, яшчэ і моцна абняўшыся. Так ім цёпла і бяспечна.

Пад гэтай халоднай слатой яны, пэўна, ужо забіраюцца ў свае «гнёзды» і ўладкоўваюцца. Вялікія, пухнатыя, нікім асабліва не любімыя — у нас гэтых жывёл адносяць да так званых інвазіўных (непажаданых) відаў. Засынаюць у сваім цесным утульным свеце, забываючы пра варожасць і нягоды свету навакольнага, адчуваючы толькі цяпло таго, хто побач, і яго дыханне...

Чамусьці менавіта гэтая непрыдуманая гісторыя з серыі «У свеце жывёл» узгадалася і ажыла ва ўяўленні пад кастрычніцкім пранізлівым надакучлівым дажджом. Хоць я ведаю, чаму. Ужо каторы дзень цвяліць душу іншая гісторыя — з серыі «У свеце людзей». Пачутая ад выпадковай спадарожніцы па дарозе з камандзіроўкі тры тыдні таму, яна пазбавіла душэўнага камфорту, менавіта яна згадваецца ў восеньскім ветраным неспанні.

ЖЫЛА звычайная сям'я, якіх тысячы. Муж, жонка, двое дзетак. У іх была невялікая сямейная справа — займаліся вырабам экалагічнай прадукцыі (сёння гэта ў трэндзе). Узялі крэдыт на льготных умовах, справы ішлі нядрэнна. Да таго часу, пакуль на гэтым рынку не з'явіліся больш упэўненыя, больш вопытныя канкурэнты — са сваёй службай маркетынгу, з цэлай праграмай работы ў сецыве. У іх нічога падобнага не было, пачынаць усё з нуля — яшчэ дадатковыя выдаткі. Карацей, справу яны ціхенька згарнулі. А крэдыт застаўся. Немалы, са штомесячнай выплатай.

Яны збіраліся вечарам на кухні, пралічвалі, што можна прадаць, ад чаго адмовіцца, на чым сэканоміць. Банк (камерцыйны) ні на якія патуранні не ішоў, патрабаваў своечасовага пагашэння немалой сумы, пагражаў судом. Працэнты аказаліся высокімі (яны такімі і былі з самага пачатку, але тады здавалася — дробязь). Каб іх неяк пагасіць, пераехалі жыць да бацькоў жонкі, сваю кватэру пачалі здаваць. Дапамагло, але ненадоўга.

Тады муж вырашыў паспрабаваць шчасця ў казіно (кажуць жа, навічкам шанцуе). Але фартуна і тут адвярнулася. Мала таго, што прайграў апошняе, што наскрэблі на гэту авантуру, дык яшчэ і вінен застаўся...

Зрэшты, гэта ўсё лірыка. Драма пачалася пасля. Галава сям'і знайшоў выйсце з заблытанай сітуацыі. Ён проста з'ехаў у суседнюю Латвію (балазе, шэнген у яго быў доўгатэрміновы, а там яшчэ за савецкім часам і сястра родная атабарылася). Крэдыт быў у свой час афармлены на жонку — у яе на момант афармлення даход быў большы. З казіно таксама цяпер паперы прыходзяць на іх агульны хатні адрас. Жанчына засталася з дзецьмі і з кучай даўгоў на руках, пакуль чалавек за мяжой сядзіць.

І ўсё гэта можна было б і зразумець, і нават перацярпець. Але ў сацыяльнай сетцы на сваёй старонцы ён выклаў сваё фота з новай пасіяй, дзябёлай бландзінкай. Муж сястры, не апошні чыноўнік у сваім горадзе, здабыў яму пасведчанне на права жыхарства. Вяртацца на радзіму пакуль (прынамсі да выплаты ўсіх пазык) ён не збіраецца.

Жонка, пра ўсе гэтыя «выбрыкі» даведаўшыся, на развод падала. На што ён ёй па электроннай пошце цынічна так адказаў: я табе, маўляў, дам развод. Гадоў праз дзесяць, калі дзеці падрастуць. А то яшчэ аліменты плаціць — мне гэта сто гадоў не патрэбна... І знік. Знішчыў усе свае старонкі ў сацыяльных сетках, адключыў sim-карткі тэлефона. Добрыя людзі казалі — з'ехаў на заробкі ці то ў Ірландыю, ці то ў Ісландыю. Карацей, шукай ветру ў полі...

МНЕ гэту гісторыю расказала маці яго жонкі, з якой мы тры гадзіны трэсліся ў маршрутцы з Полацка ў сталіцу. Бабуля ехала пабыць з малымі: дачка знайшла яшчэ адну падпрацоўку позна ўвечары, дзяцей няма з кім пакінуць, а даўгі трэба аддаваць. «А такі, здавалася, добры чалавек, і сям'ю любіў, і гаспадар быў неблагі, а тут, бач, як яго скруціла...» (Ці здалося, ці яна сапраўды яго шкадуе?)...

...Я вось думаю: чаму янотападобныя сабакі ў нас прыжыліся і вельмі нават няблага сябе адчуваюць? Нягледзячы на тое, што ніхто іх асабліва не ахоўвае, паляваць на іх можна, і футра ў іх даволі прыгожае. Можа, з-за гэтай сваёй звычкі — спаць, калі паляўнічы сезон у разгары? А хутчэй з-за таго, што сярод не вельмі спрыяльна настроенага да іх наваколля яны прыціскаюцца адно да аднаго, дзеляцца ўласным цяплом і дыханнем.

Вось бы людзям у іх павучыцца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# СПРАВА АБ КРАДЗЯЖЫ ПЕРАРАСЛА Ў ДАНОС

**Да сталічных праваахоўнікаў з заявай аб прапажы ў яго грошай звярнуўся 32-гадовы мінчанін. Неўзабаве справа аб крадзяжы сродкаўператварылася ў... ілжывы данос.**

Паводле інфармацыі Ленінскага РУУС сталіцы, мужчына патлумачыў, што напярэдадні ўвечары забраў у даўжніка 4 тысячы долараў, пасля чаго яны разам выпілі. У канцы вечара грамадзянін выклікаў таксі і выправіўся дадому. Аднак па дарозе вырашыў скарыстаца паслугамі путаны. У яе кампаніі мужчына і правёў астатні час вечара. Потым аплаціў «паслугі» і лёг спаць. А ранкам выявіў, што ў яго прапалі 3,7 тысячы долараў і звярнуўся ў міліцыю. Відома, пад падазрэнне трапіла незнаёмка, з якой пацярпелы бавіў час напярэдадні. Аператыўнікі хутка ўстанавілі асобу прафесіяналкі, але падчас разбору было ўстаноўлена, што яна ўзяла за «работу» толькі 300 долараў. Пазней у кватэры мужчыны міліцыянеры ў кухонным гарнітуры знайшлі быццам бы скрадзеныя 3,7 тысячы «зялёных». У дачыненні да жанчыны былі складзены адміністрацыйныя пратакол за занятак прастытуцыяй, а вось што датычыцца заяўніка, дык па факце лжывага даносу праводзіцца праверка, па выніках якой дзеяннем мужчыны будзе дадзена прававая ацэнка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

IdeaBank
Отличная идея!

## ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2015 | на 1 октября 2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 370 326 | 227 813 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 163 915 | 71 674 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 514 259 | 365 093 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 26 332 | 95 194 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 783 014 | 1 753 507 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 869 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 53 | 33 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 294 088 | 243 809 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 240 914 | 163 100 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 393 770 | 2 920 223 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 325 184 | 127 376 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 2 479 940 | 2 302 503 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 104 | 104 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 46 603 | 13 596 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 38 578 | 18 378 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 890 409 | 2 461 958 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 148 115 | 148 115 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 42 961 | 38 792 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 43 859 | 19 580 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 268 426 | 251 778 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 503 361 | 458 265 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 393 770 | 2 920 223 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 3 квартал 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2015 | на 1 октября 2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 535 396 | 671 771 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 405 092 | 459 552 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 130 304 | 212 219 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 207 727 | 227 595 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 56 178 | 74 773 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 151 549 | 152 822 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | (190) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 156 153 | 57 416 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (49 619) | (13 632) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 164 968 | 168 460 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 124 741 | 60 105 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 245 687 | 228 319 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 13 831 | 12 998 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 88 642 | 58 963 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 26 314 | 12 390 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 62 328 | 46 573 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | |

Председатель Правления Папушева Е.М.

Главный бухгалтер Глазырина О.В.

20 октября 2015 года

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»).
Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года.
УНП 807000122

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.**

**Продавец:** ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М.Горького, 62, (033) 648-18-60.

**Лот №1.** Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145064, зав. №51853. **Начальная цена: 1 579 700 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 157 970 000 бел. руб. Шаг аукциона – 78 985 000 бел. руб.**

**Лот №2.** Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145063, зав. №51852. **Начальная цена: 1 579 700 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 157 970 000 бел. руб. Шаг аукциона – 78 985 000 бел. руб.**

**Лот №3.** Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145072, зав. №51854. **Начальная цена: 1 608 100 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 160 810 000 бел. руб. Шаг аукциона – 80 405 000 бел. руб.**

**Лот №4.** Грузовой бортовой GAZ 3307, гос. номер 9901 ВТО, 1993 г. в., цвет голубой. **Начальная цена: 25 400 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 2 540 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 270 000 бел. руб.**

**Лот №5.** Гидроподъемник ХТЗ Т-16, 1993 г. в., инв. №161036. **Начальная цена: 37 200 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 3 720 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 860 000 бел. руб.**

**Лот №6.** Оборудование навесное снегоочистителя фрезерно-роторного ОФР-200, 2011 г. в., инв. №145035. **Начальная цена: 89 720 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 8 972 000 бел. руб. Шаг аукциона – 4 486 000 бел. руб.**

**Лот №7.** Прицеп 2 ПТС-4, гос. номер БХ 6680, 1998 г. в. **Начальная цена: 13 400 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 1 340 000 бел. руб. Шаг аукциона – 670 000 бел. руб.**

**Лот №8.** Трактор МТЗ-82.1, гос. номер БЯ 4304, 1992 г. в. **Начальная цена: 49 300 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 4 930 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 465 000 бел. руб.**

**Лот №9.** Экскаватор ЭО-2621В, гос. номер БЯ 4305, 1992 г. в. **Начальная цена: 65 300 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 6 530 000 бел. руб. Шаг аукциона – 3 265 000 бел. руб.**

**Лот №10.** Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1992 г. в., инв. №144637. **Начальная цена: 19 800 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 1 980 000 бел. руб. Шаг аукциона – 990 000 бел. руб.**

**Лот №11.** Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1984 г. в., инв. №143668. **Начальная цена: 12 520 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 1 252 000 бел. руб. Шаг аукциона – 626 000 бел. руб.**

**Лот №12.** Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1985 г. в., инв. №143886. **Начальная цена: 12 520 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 1 252 000 бел. руб. Шаг аукциона – 626 000 бел. руб.**

**Лот №13.** Станок сверлильный (2М112), 1993 г. в., инв. №144739. **Начальная цена: 9 230 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 923 000 бел. руб. Шаг аукциона – 461 500 бел. руб.**

**Лот №14.** Станок горизонтально-фрезерный 6Т80Ш, инв. №141180, 1947 г. в. **Начальная цена: 39 530 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 3 953 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 976 500 бел. руб.**

**Лот №15.** Станок горизонтально-фрезерный 2М82, инв. №141202, 1966 г. в. **Начальная цена: 20 960 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 2 096 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 048 000 бел. руб.**

**Лот №16.** Станок горизонтально-фрезерный 6Р81, инв. №143649, 1984 г. в. **Начальная цена: 16 930 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 1 693 000 бел. руб. Шаг аукциона – 846 500 бел. руб.**

**Лот №17.** Станок горизонтально-фрезерный 6Т80Ш, инв. №144699, 1993 г. в. **Начальная цена: 46 170 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 4 617 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 308 500 бел. руб.**

**Лот №18.** Станок токарно-винторезный 16Д20, инв. №144698, 1993 г. в. **Начальная цена: 27 550 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 2 755 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 377 500 бел. руб.**

**Лот №19.** Станок токарно-винторезный 16Д20, инв. №141217, 1966 г. в. **Начальная цена: 23 810 000 бел. руб. без НДС. Размер задатка: 2 381 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 190 500 бел. руб.**

Торги состоятся **25.11.2015 г. в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 23.10.2015 с 8.30 по 24.11.2015 г. до 17.30.** Сумма задатков перечисляется на р/с 3012411521014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М.Горького, 62. Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества

